незалежная газета

# Наша Ніва

№ 42 (640) 11 лістапада 2009 www.nn.by

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**«12 ці 15 прапановаў ЕС можна спакойна прыняць»**

Старонка 5



**Бермудскі трохкутнік над Беларуссю**

Старонка 6



**N.R.M. перапыняе маўчанне**

Старонка 2

## У НУМАРЫ

**Макей загаварыў пра незваротнасць**

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта цытаваў Гётэ і Шпенглера. **Старонка 3.**

**Уладзімір Някляеў: «Час удзелу інтэлігенцыі ў палітычнай барацьбе праміну́ў»**

«А дэзерціраў з наменклатуры больш не будзе, бо Лукашэнка ўзаконіў прыбыткі чыноўнікаў». **Старонка 7.**

**Бангалор, Дразды і Ждановічы аддадуць Расіі**

Узамен Беларусь атрымае кавалак чарнаморскага ўзбярэжжа ў Сочы. **Старонка 4.**

**Педафілія на «Беларусьфільме»?**

Па падазрэнні ў здзяйсненні распусных дзеянняў затрыманы рэжысёр Аляксей Туровіч. **Старонка 6.**

**Прыстаўлены да Коласа**

Спо́ўнілася сто гадоў з дня нараджэння Максіма Лужаніна — аднаго з самых знакамітых савецкіх агентаў у шэрагах беларускай інтэлігенцыі. **Старонка 12.**

# Ацэнка рэсурсу

14 лістапада пройдзе «Еўрапейскі форум» — вялікі збор прыхільнікаў Мілінкевіча. **Старонка 5.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Ад пнеўманіі ў Гомельскай вобласці памерлі 8 чалавек

На Гомельшчыне пнеўманія дыягнаставана ў 827 чалавек, у сталіцы — прынамсі, у 1266.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Сёлетні грып асаблівы: ён дае шмат ускладненняў у маладых людзей. Самае частае ўскладненне — гэта хуткацечная пнеўманія.

На Гомельшчыне пнеўманія дыягнаставана ў 827 чалавек, у тым ліку ў 643 дарослых і ў 184 дзяцей. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Гомельскага аблвыканкама.

Усяго ў вобласці з 2 па 9 лістапада дыягназ «грып» і «вострыя рэспіраторныя захворванні (ВРЗ)» пастаўлены 48 752 чалавекам, з іх удзельная вага дзяцей склала 49% (24 051), дарослых — 51% (24701). Доля шпіталізаваных склала 2,7% (1299 чалавек). Сярод шпіталізаваных пераважаюць дзеці (60%).

**Працяг на старонцы 2.**

## Маладую доктарку забілі за мабільнік

Трагедыя адбылася на вуліцы Ангарскай у Мінску.

Трыццацігадовая Вольга Лівянцова, лекарка 9-й мінскай дзіцячай паліклінікі, увечары 7 лістапада вярталася дадому да сваіх двух дзетак — 4 і 9 гадоў. Аднак да кватэры так і не дайшла: каля ліфта ў пад'ездзе дома на вуліцы Ангарскай яе зарэзалі. Акрамя мабільнага тэлефона, забойца нічога не забраў...

Ірына Сілінская, галоўурач паліклінікі, дзе працавала Вольга, кажа: «Пад назіраннем у паліклініцы 15 тысяч дзетак, а мы згубілі такога спецыяліста ў галіне ўльтрагукавой дыягностыкі. Аднак гэта яшчэ большая бяда для тых, каму Вольга была маці, жонкай альбо дачкой».

Па факту забойства заведзеная крымінальная справа. Вядзецца следства. Падрабязнасцяў міліцыя пакуль не паведамляе.

**Настасся Шамрэй**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Няблізкая Эстонія

Маленькая нацыя здолела за кароткі час збудаваць паспяховую дзяржаву. Не верыцца, што дваццаць гадоў таму мы жылі ў адной камуналцы. Піша Зміцер Панкавец. **Старонка 8.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## Ад пнеўманіі...

Працяг са старонкі 1.

Ад пнеўманіі ў Гомельскай вобласці памерлі 8 чалавек. Аб выяўленых выпадках грыпу A(H1N1) прэс-служба не паведамляе, як і абласны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.

Свежай інфармацыі ў агульнанацыянальным маштабе па стане на аўторак няма. Галоўная санітарная доктарка краіны Валянціна Качан заявіла пра зніжэнне колькасці новых хворых на 4—25%. Варта адзначыць, што ў мінулыя тыдні яна давала інфармацыю, якую незалежныя СМІ пасля дакументальна абверглі — пра адсутнасць смяротных выпадкаў і дэфіцыту медыкаментаў.

У мінулую пятніцу старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітры Піневіч назваў лічбу 1266 захварэлых на пнеўманію ў сталіцы ад пачатку эпідэміі. Лічбы ахвяраў ён не назваў. Вось што ён сказаў: «На жаль, яна [лічба] павялічваецца. Я ніякім чынам не спрашчаю сітуацыю, скажу — пнеўманіі дастаткова шмат, гэта адна з асаблівасцей эпідсітуацыі. Я хачу сказаць, што ўсе краіны свету паказваюць да сотні памерлых ва ўмовах віруснай інфекцыі. Церпяць перадусім людзі, што маюць захворванні, а таксама тыя, хто перанёс аперацыйныя ўмяшальніцтвы, але, на жаль, у нас ёсць страты сярод маладых людзей. Гэта адзін з непрыемных момантаў гэтай эпідэмічнай сітуацыі».

Вядома, што за першыя два тыдні эпідэміі ў Мінску з грыпам і ВРВІ ў паліклінікі звярнуліся 108 тыс. жыхароў сталіцы.

У аптэках і медустановах Мінска і іншых гарадоў застаюцца перабоі з марлевымі павязкамі. Дагэтуль няма ў аптэках у дастатковай колькасці некаторых антывірусных прэпаратаў і прафілактычных сродкаў.

**Мікола Бугай; інф. з Гомеля: Алена Германовіч, БелаПАН**

# N.R.M. перапыняе маўчанне



PHOTOBYMEDIA.NET

**17 снежня ў КЗ «Мінск»** гурт N.R.M. з праграмай «Вялікі акустычны калядны канцэрт». **Пачатак — 19.00.** Квіткі ад 20 да 45 тыс. Даведка і замова квіткоў: 655–55–96 (Velcom), 655–55–96 (МТС), (17) 280–15–10, а таксама праз сайт soundline.by. Уладальнікі першых 100 квіткоў, замоўленых праз сайт, атрымліваюць у падарунак рарытэтны CD.

Гурт дасць канцэрт у КЗ «Мінск».

Гурт Лявона Вольскага быў адзіным са спісу забароненых выканаўцаў, які не скарыстаўся магчымасцю выступаць пасля сустрэчы ў Адміністрацыі прэзідэнта. І вось пасля паўзы, што цягнулася з год, N.R.M. выступаюць у Мінску. Нагода — 15-годдзе гурту.

Пасля таго як у Адміністрацыі прэзідэнта рокерам паабяцалі зняць усе забароны, гурт N.R.M. практычна знік з музычнага далягляду і адмаўляўся ад удзелу ў канцэртах і фестывалях на тэрыторыі Беларусі. Самі музыкі тлумачылі гэта тым, што ўзялі творчы адпачынак. «Трэба вытрымаць паўзу. Тры гады нельга было граць, а цяпер гэта нават заахвочваецца. Думаю, што, наадварот, у гэтай сітуацыі трэба крышачку памаўчаць ды падумаць», — прызнаўся Вольскі ў адным са сваіх інтэрв'ю. За гэты час гурт сабраўся ўсяго некалькі разоў і тое дзеля канцэртаў па-за межамі краіны.

І вось музыкі прынялі рашэнне даць вялікі канцэрт — у канцэртнай зале «Мінск» 17 снежня. Гэта будзе першы іх выступ за гэты год у сталіцы. Нагода — 15-годдзе N.R.M., якое вырашана справіць акустычным канцэртам. Лявон Вольскі прызнаецца, што такі камерны фармат яму больш даспадобы, бо мае больш хатнюю атмасферу, дае магчымасці для імправізацыі ды і наогул атмасфера на такіх выступах больш добразычлівая.

**udf.by**

### ARCHE ў Гродне

Прэзентацыя новага нумара часопіса ARCHE, прысвечанага ўз'яднанню Беларусі 17 верасня 1939 года, мае адбыцца ў Гродне **17 лістапада**. Вялікі тэматычны нумар, які складаецца з 430 старонак з мноствам ілюстрацый, будзе ўпершыню прэзентаваны ў офісе Саюза палякаў Беларусі па адрасе: вул. Будзённага, 48, у пакоі №100. Пачатак у 18.30. Уваход вольны. **19 лістапада** прэзэнтацыя часопіса ARCHE адбудзецца ў памяшканні Таварыства беларускай школы Гродна. Пачатак у 18.30.

## СЦІСЛА

### Квадратны метр даражэе

Цана на квадратны метр жылля ў Мінску за тыдзень узрасла на $7. Цяпер метр каштуе $1388. Новабудоўлі працягваюць таннець. Цана на іх апусцілася да $1258 за метр.

### 13-гадовая школьніца з Нясвіжа нарадзіла дзіця

Ад пачатку года гэта ўжо трэцяя малалетняя маці ў раёне. Яшчэ адна 16-гадовая дзяўчына нарадзіла ўжо другое дзіця. Першае ў яе з'явілася тры гады таму. Абодва дзіцяці маюць аднаго і таго ж юнага бацьку. Бацькі нясвіжскіх Рамэа і Джульеты забараняюць ім ажаніцца.

### Даляр у піке

Пасля тыдня ўмеранага аптымізму даляр зноў губляе пазіцыі. На сусветных таргах суадносіны еўра і даляра зноў пераадолелі псіхалагічную адзнаку ў 1,5.

### Для наведвання басейнаў больш не трэба медычнай даведкі

З 1 снежня ўступаюць у сілу новыя санітарныя нормы і гігіенічныя нарматывы басейнаў. Варта адзначыць, што не трэба даведак для хаджэння ў басейн і ў большасці еўрапейскіх краінаў. Яны былі па большай частцы фармальнасцю. Даведкі выдаваліся раз на год, між тым скурныя хваробы могуць праяўляцца і знікаць. Затое цяпер людзей пазбавілі ад стаяння ў чэргах у паліклініках. А вось шапачкі застаюцца абавязковымі.

**ЯМ; паводле БЕЛТА, Еўрарадыё, realt.by**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам

Мікалаю К., Алесю П., Аляксандру Р. з Полацкага раёна.
Наталлі У. з Пухавіцкага раёна.
А.Б. з Ваўкавыскага раёна.
Паўлу Д., В.Б. са Светлагорскага раёна.
Леакадзіі Н., Ганне Р. з Валожынскага раёна.
Наталлі Т., Мікалаю М. з Салігорска.
Ірыне Ц. з Жыткавіцкага раёна.
Вользе П. з Бабруйскага раёна.
Аляксандру Г. з Кіраўскага раёна.
С.Р., Т.Ш. з Бярозаўскага раёна.
М.Б. з Дубровенскага раёна.
Юрыю Г. з Гродна.
Н.К. з Дубровенскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Мікалаю П. з Віцебска.
Міхаілу К. з Рэчыцкага раёна.
Г.Б. з Ліды.
М.Ш. з Клімавіцкага раёна.
В.Л. са Смаргонскага раёну.

# Макей загаварыў пра незваротнасць



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Злева направа: Уладзімір Макей, Клаус Мангольд і пасол Вайс.

У адрозненне ад мінулага года, дыскусіі на адкрыцці Мінскага форуму не прадугледжваліся, таму Уладзіміру Макею не прыйшлося адказваць на непрыемныя пытанні. Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта, які разам з паслом Германіі Вайсам і кіраўніком Усходняга камітэта нямецкай эканомікі прафесарам Мангольдам форум адкрываў, выступаў упэўнена і жыццярадасна.

На самым пачатку ён заявіў, што разлічвае на актыўны ўдзел нямецкіх партнёраў у прыватызацыі. Параўнаў нармалізацыю адносінаў Еўропы з Беларуссю з падзеннем Берлінскай сцяны ў агульнаеўрапейскім маштабе. За апошні год, сказаў ён, было дасягнута больш, чым за ўсе папярэднія гады ізаляцыі.

І працытаваў словы Далі Грыбаўскайтэ пра бясплённасць палітыкі ізаляцыі, якімі тая адказала на крытыку Андрэя Саннікава ў Рызе.

Акрамя Грыбаўскайтэ, Макей цытаваў Гётэ: «Той, хто хоча ступаць упэўнена, павінен ступаць паволі». І заклікаў да цярпення.

У параўнанні з мінулым годам у Макею дадалося ўпэўненасці і публічнасці. У ім стала больш чагосьці такога пуцінскага ў інтанацыях.

Памылкова ацэньваць сітуацыю ў Беларусі толькі па грамадска-палітычнай сферы, але трэба таксама і па стабільнасці ў сацыяльна-эканамічнай сферы, нізкім узроўні беспрацоўя, стане сістэмы аховы здароўя, даказваў Макей.

Беларусь спадзяецца на поўнае зняцце санкцый у лістападзе. Усе іншыя рашэнні будуць перашкодай, — строга, але неяк паспешліва заявіў ён. І, не зрабіўшы належнай паўзы, пайшоў ганіць тактыку бізуна і перніка, выступаць за ўцягванне краіны ў інтэграцыю без папярэдніх умоваў.

А ў чым інтэграцыя? Беларусь зацікаўленая ў крэдытах і інвестыцыях, заявіў ён і доўга пералічваў установы, ад якіх такоўскія могуць прыплыць. У той жа час «Беларусь не ставіць задачы поўнага ці асацыяванага членства ў Еўрасаюзе», сказаў Макей.

Ён заклікаў да змякчэння візавага рэжыму, прывёўшы лічбы: у 2008 годзе Еўрасаюз наведалі у 20% грамадзянаў Беларусі менш, чым у 2007-м.

Скончыў ён цытатай са Шпэнглера пра незваротнасць усяго таго, што адбываецца (пры гэтым Освальда Шпэнглера назваў Ота). У зале кожны зразумеў цытату пасвойму.

Але энтузіязму яна не выклікала.

**Мікола Бугай**

У сваім выступе кіраўнік Усходняга камітэта нямецкай эканомікі прафесар Клаус Мангольд падтрымаў Макея адносна «неабходнасці цярпення». «За кожнай ідэяй павінны стаяць людзі. Не трэба прыходзіць сюды [у Беларусь] з бачаннямі», — заявіў ён. Мангольд, між іншым, паведаміў, што ён сёлета ў Беларусі «чацвёрты ці пяты раз».

**XII Мінскі форум**

прайшоў у Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Яганэса Рау з 4 па 6 лістапада. Сёлета яго тэма: «Беларусь і Усходняе партнёрства: перспектывы развіцця ў сферах палітыкі, эканомікі і грамадства». На форум з'ехаліся ўрадоўцы, навукоўцы, дэпутаты з розных еўрапейскіх дзяржаваў.

На адкрыцці прысутнічалі 13 акрэдытаваных у Мінску паслоў, а ўсяго — прадстаўнікі 21 краіны. У прыватнасці, паслы ФРГ і Швецыі Гебхарт Вайс і Стэфан Эрыксан, намеснік міністра замежных справаў Літвы Эвалдас Ігнатавічус, старшыня Усходняга камітэта германскай эканомікі Клаус Мангольд.

На Форуме працавалі тры працоўныя групы: «Замежная палітыка: Беларусь — сусед у Еўропе», «Эканоміка: новыя задачы эканамічнай палітыкі», «Грамадства: новыя формы ўзаемадзеяння паміж дзяржавай і грамадствам».

Звярнула ўвагу тое, што падчас Форуму нямецкія мадэратары ў некалькіх выпадках пазбаўлялі прысутных прадстаўнікоў апазіцыі магчымасці выказвацца, матывуючы гэта недахопам часу. На мінулым Форуме такога не здаралася.

**Заходні назіральнік: Мяне ўразіла савецкасць Макея**

«Мяне ўразіла савецкасць Макея. Я чакаў усё ж большае еўрапейскасці ад гэтага чыноўніка, улічваючы ролю, якая яму прыпісваецца», — сказаў «НН» адзін з еўрапейскіх палітычных аналітыкаў, які ўпершыню пабываў на Мінскім форуме. На думку палітычнага аналітыка, які пажадаў застацца ананімным, «савецкай» была як манера выступаць, так і аргументацыя, якую прывёў кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі.

# Лукашэнка — Юшчанку: Мы будзем абапірацца адзін на аднаго

**Кіраўнік Беларусі 4–6 лістапада наведваў Украіну. Гэта выклікала нервовую рэакцыю ў Маскве.**

Гэта ўжо другі візіт Лукашэнкі ва Украіну цягам года. Першы, неафіцыйны, адбыўся яшчэ ў студзені, калі лідэры дзяржаваў сустракаліся ў памежным Чарнігаве. Потым былі заявы ў Кішынёве на саміце СНД, дзе Лукашэнка і Юшчанка на пару крытыкавалі палітыку Расіі. Рабілася гэта напярэдадні, як заўсёды цяжкіх, перамоваў адносна паставак расійскага газу.

Цяпер жа Лукашэнка і Юшчанка ў Кіеве дамовіліся аб тым, што бліжэйшым часам усё ж будзе падпісаная шматпакутная дамова аб дзяржаўнай мяжы, якая не магла быць ратыфікаванай доўгія гады.

Ёсць інфармацыя, што ўзамен украінцы паабяцалі расплаціцца з беларусамі за пазыкі прадпрыемстваў. Пагашаць доўг будуць пастаўкай украінскай электраэнергетыкі па льготных цэнах. Праўда, няма ніякай яснасці, колькі ж украінцы вінныя: ці 60 мільёнаў даляраў, ці 230?

Кіраўнік Беларусі назваў гэтую сустрэчу «ўкладам у еўрапейскую стабільнасць». «Мы тут сустракаемся, каб абмеркаваць выклікі сучаснасці. І не толькі тыя выклікі, якія ляжаць у плоскасці беларуска-ўкраінскіх стасункаў — гэта выклікі планетарнага маштабу, з якімі сутыкаецца ўся Еўропа».

Потым Лукашэнка дадаў, што адносіны паміж Беларуссю і Украінай «у апошні час напружваюць некаторых кіраўнікоў у асобных дзяржавах». Затым крыху паправіўся: «Я не маю на ўвазе толькі Расію. Менш за ўсё я маю на ўвазе Расію. Гэта напружанасць існуе і ў іншых дзяржавах. Вядома ж, гэты альянс (у добрым сэнсе слова) двух вельмі блізкіх народаў Беларусі і Украіны дае магчымасць жыць нашым людзям лепш. Мы будзем абапірацца адзін на аднаго», —сказаў А.Лукашэнка.

Потым ён падзякаваў прэзідэнту Украіны за «каласальную падтрымку» па выбудоўванні адносінаў Беларусі з іншымі дзяржавамі, найперш — заходнімі.



Ва Украіну Лукашэнка прылятаў з 5-гадовым Мікалаем. Як зафіксавалі фатографы, ён сядзеў побач з бацькам як найважнейшы член беларускай дэлегацыі. Насупраць яго з украінскага боку знаходзілася кіраўніца Сакратарыята прэзідэнта (аналаг беларускай Адміністрацыі) і толькі далей — віцэ-прэм'ер Сямашка і міністры замежных справаў дзвюх краінаў.

Такія ўколы ў бок Расіі балюча ўспрынялі ў Маскве. Пракрамлёўскае выданне «Камерсант» піша: «Збліжэнне Украіны і Беларусі адбываецца на хвалі імкнення абедзвюх краін супрацьстаяць ціску Расіі. І Аляксандр Лукашэнка ўчора даў зразумець, што Беларусь свядома ідзе на гэта».

Апроч нейкіх канкрэтных рашэнняў, ва Украіне Лукашэнка зрабіў шэраг сімвалічных крокаў. 5 лістапада ён з Юшчанкам наведаў помнік ахвярам Галадамору. «У тым, што мы сюды прыехалі з Віктарам Юшчанкам, няма ніякай палітыкі. Тут загінулі мільёны людзей. Мы прыехалі, каб аддаць даніну памяці і павагі ахвярам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка журналістам.

У Кіеве кіраўнік Беларусі заклаў памятны камень на месцы будучага помніка Уладзіміру Караткевічу, а таксама ўзяў удзел у адкрыцці Цэнтра беларускай мовы і культуры на базе Інстытута філалогіі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі.

Скончыўся ж візіт наведваннем Івана-Франкоўска, эпіцэнтра свінога грыпу. Туды Лукашэнка прывёз гуманітарную дапамогу: маскі, супрацьвірусныя прэпараты. Хоць яшчэ ў кіеўскім аэрапорце Лукашэнка прызнаўся, што ажыятаж вакол грыпу разводзяць замежныя фармацэўтычныя кампаніі.

**Зміцер Панкавец**

**Лукашэнка стаў доктарам**

А.Лукашэнка атрымаў званне ганаровага доктара Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Т.Шаўчэнкі. Дыплом уручыў рэктар гэтай ВНУ. Званне было прысвоена Лукашэнку «за вялікі ўклад у справу развіцця двухбаковых беларуска–ўкраінскіх адносін, умацаванне культурных і адукацыйных сувязей». Цяпер ганаровымі дактарамі ўніверсітэта з'яўляюцца 75 чалавек. Сярод іх прэм'ер–міністр Індыі Індзіра Гандзі, экс–прэзідэнт ЗША Біл Клінтан, экс–прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Гавел, а таксама Іслам Карымаў, Міхаіл Саакашвілі, Эмамалі Рахмон.

## СЦІСЛА

### БХД падала дакументы на рэгістрацыю

Сустаршыні партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя 9 лістапада падалі ў Міністэрства юстыцыі дакументы на рэгістрацыю партыі. Гэта ўжо трэцяя спроба зарэгістравацца.

### Аўтуховіча і Асіпенку не выпускаюць

Следства па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі працягнута на месяц — да 8 снежня.

### Генпракурор не адважыўся дапытаць Лукашэнку

«Дакументальных звестак аб скажэнні вынікаў праведзеных 19.03.2006 г. выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама звестак аб якіх-небудзь іншых парушэннях палажэнняў Выбарчага кодэксу пры падліку галасоў і абвяшчэнні вынікаў выбараў Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь не мае». Так адказаў Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч на запыт старшыні АГП Анатоля Лябедзькі.

**ЗП**

# «Тое, што вы гандлюеце з Венесуэлай, палохае людзей!»

На Мінскім форуме абмеркавалі новыя выклікі эканамічнай палітыкі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Адзін з накірункаў XII Мінскага форуму — «Эканоміка: новыя выклікі эканамічнай палітыкі» — сабраў каля ста ўдзельнікаў. Было заўважна, што лічба замежнікаў нашмат пераўзыходзіла колькасць беларусаў.

Былі прадстаўнікі міністэрстваў прамысловасці, эканомікі і замежных спраў Беларусі, Нацбанка і Мытнага камітэта. Думку незалежных эканамістаў прадстаўляў кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанід Заіка.

### Барацьба за рэйтынгі

Начальнік галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду Нацбанка Сяргей Дубкоў выявіўся хіба што не асноўным прыхільнікам пераходу беларускай эканомікі на рынкавыя рэйкі. Сярод агучаных ім планаў і прапановаў на бліжэйшую будучыню — адаптацыя беларускага заканадаўства да еўрапейскіх нормаў, ліквідацыя тарыфнай сеткі, дазвол на ўсталяванне свабодных цэн, без абмежавання надбавак. Істотным накірункам дзейнасці Сяргей Дубкоў лічыць іміджавы. Дзеля гэтага запланаваная своеасаблівая «барацьба за рэйтынгі». «Беларусь павінна займаць хаця б 30—50-я месцы ў эканамічных рэйтынгах», — мяркуе чыноўнік.

### Пракаповіч — наступны «генсек»?

Далей былі цікавыя пасажы ад намесніка міністра эканомікі Беларусі Андрэя Тура і Леаніда Заікі. Тур мяркуе, што гіганцкае адмоўнае сальда гандлёвага балансу Беларусі — больш за $5 мільярдаў за дзевяць месяцаў — «зачын для імклівага развіцця эканомікі». Ён патлумачыў слухачам, што сапраўдная прычына гіганцкага адмоўнага сальда — не перапоўненыя склады. На яго думку, вінаваты «інвестыцыйны імпарт». Іншымі словамі, Беларусь прыцягвае вельмі шмат інвестыцый. Гэта своеасаблівы прыцэл на будучыню: «Мы рыхтуем зачын для гатоўнасці нашай індустрыі запаўняць новыя збыту».

А незалежны эканаміст Заіка параўнаў дзеянні Нацбанка з дзейнасцю камісіі па падрыхтоўцы пахаванняў генеральных сакратароў у СССР.

Такую паралель ён правёў, каментуючы тое, што Лукашэнка некалькі дзён таму раскрытыкаваў дзеянні ўрада і даў загад Нацбанку самастойна рыхтаваць праграму эканамічнага развіцця краіны на наступны год. Заіка паправабаваў растлумачыць нямецкім удзельнікам форуму, што імя новага прэм'ера вырашана: «Як у СССР — хто арганізуе пахаванне, той і будзе кіраваць пасля». На яго думку, пасада прэм'ер-міністра ад Пятра Пракаповіча ўжо нікуды не ўцячэ.

### Германія не разумее Мытнага саюза

Атмасферу стрыманай добразычлівасці перапыніў эмацыйны выступ нямецкага дэпутата Георга Шырмбэка. Спачатку ён пахваліў прадукцыю Мінскага трактарнага завода — «трэба прыехаць на завод, сказаць рабочым, што яны добра працуюць. Падняць іх маральны дух». А пасля перайшоў у рашучы наступ: «Тое, што вы гандлюеце з Венесуэлай, палохае людзей! Кітай, Егіпет... — усё добра, але гэта не альтэрнатыва Еўрасаюзу! Сапраўдныя грошы трэба зарабляць у Еўропе і ЗША.

Мытным саюзам з Казахстанам вы адпужваеце нас. Я спытаў у нямецкага Міністэрства замежных справаў, што гэта за ўтварэнне. Я не скажу, што яны адказалі, але асноўная выснова — у сутнасці дамовы нічога незразумела. Мытны саюз шкодны для Беларусі», — вынес прысуд дэпутат Бундэстага.

Яму запярэчыў Андрэй Тур:

— Уся праблема ў псіхалогіі. Мытны саюз — найвыгаднейшая рэч для Еўрасаюза. Гэта неабсяжны рынак, які адкрываецца ад Брэста да Уладзівастока.

Адказаўшы, праз некалькі хвілін намеснік міністра эканомікі пакінуў форум, спаслаўшыся на занятасць.

### «Мы мелі прэтэнзіі, пакуль мелі грошы»

Валерый Садоха, дырэктар Дэпартамента замежнаэканамічнай дзейнасці МЗС, раскрытыкаваў прыхільнікаў неадкладнага ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю:

— Некаторыя постсавецкія краіны ў СГА ўступілі, але, па-мойму, не да канца зразумелі, куды ўступілі і што зрабілі для нацыянальнай эканомікі.

Мы ж ідзём паступова, ужо заручыліся падтрымкай дзесяці буйных краін: Кітая, Індыі... З некаторымі іншымі вядзем перамовы. Але мы пакуль не гатовыя да рэзкага зніжэння мытаў.

Увогуле ж форум — прынамсі яго эканамічная секцыя — вызначыўся амаль поўнай абыякавасцю да палітыкі. Як адзначыў у кулуарах адзін з нямецкіх бізнэсоўцаў, «мы мелі прэтэнзіі да Беларусі, пакуль у нас былі грошы. Цяпер гэта другаснае. Мы з беларусамі проста партнёры».

**Ягор Марціновіч**

# Патрыманыя аўто пакуль не падаражэюць

Дакументы на ўвоз фізічнымі асобамі тавараў і аўтамабіляў на тэрыторыю Мытнага саюза (Беларусь, Расія, Казахстан) будуць распрацаваны да ліпеня 2010 года. Пра гэта заявіў начальнік Упраўлення тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей Полудзень.

Прадстаўнік ДМК падкрэсліў, што Адзіны мытны тарыф распаўсюджваецца толькі на юрыдычных асоб. Чакаецца, што ён будзе прыняты кіраўнікамі дзяржаў Мытнага саюза і падпісаны 27 лістапада ў Мінску.

«У дачыненні да ўвозу фізічнымі асобамі не толькі транспартных сродкаў, але і ўсіх астатніх тавараў, нормы ўвозу якіх сёння прадугледжваюць нацыянальныя заканадаўствы, то яны працягваюць дзейнічаць, калі не будзе прынята нейкіх іншых рашэнняў», — сказаў Полудзень.

Начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Мікалай Бурш адзначыў, што нормы ўвозу тавараў фізічнымі асобамі на гэты момант у краінах Мытнага саюза вельмі розныя. «Мы гэта добра разумеем, таму для выпрацоўкі адзіных правіл увозу фізічнымі асобамі неабходна заключыць асобнае пагадненне трох дзяржаваў», — сказаў Бурш.

**Паводле БелаПАН**

# Галоўка часнака каштуе, як два апельсіны

За час эпідэміі грыпу часнок падаражэў у чатыры разы.

Эпідэмічная паніка сярод насельніцтва паказала, што такое сапраўдны свабодны рынак. Цэны на часнок, які ў адсутнасць лекаў у аптэках стаў ледзь не асноўным сродкам змагання з грыпам, шалёна скокнулі ўверх. Яшчэ месяц таму нармальнай лічылася цана ў 500 рублёў за галоўку. Але на мінулых выхадных бабулькі ля падземных пераходаў у Мінску, прадаючы часнок, прасілі за галоўку ўжо 2000 рублёў!

— Бярыце, цяпер танней не знойдзеце, — упэўнівалі гандляркі. — На здароўі не эканомяць!

Зразумела, на рынках, дзе выбар большы, часнок можна знайсці і за 1000 рублёў за галоўку. Прадаўцы прызнаюцца, што нягледзячы на падаражанне, тавар адрываюць з рукамі.

**ЯМ**

# Бангалор, Дразды і Ждановічы аддадуць Расіі

Паводле папярэдняга ўзгаднення, участкі ў раёне сталічнай плошчы Бангалор, у пасёлках Дразды і Ждановічы Мінскага раёна будуць перададзены ва ўласнасць Расіі.

5 лістапада дэпутаты палаты прадстаўнікоў ратыфікавалі пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб узаемнай перадачы ва ўласнасць і аб арэндзе зямельных участкаў. У адпаведнасці з пагадненнем, Расія перадасць ва ўласнасць Беларусі ўчастак у пасёлку Красная Паляна Адлерскага раёна Краснадарскага края сумарнай плошчай 16,32 гектара.

Участкі будуць выкарыстоўвацца толькі з аднолькавай мэтай — рэкрэацыйнай або сацыяльна-культурнай. Так, у Драздах участак будзе выкарыстаны для павелічэння тэрыторыі рэзідэнцыі пасла Расіі ў Беларусі. Усе ўчасткі, што перадаюцца ў Мінску і пасёлку Ждановічы, вольныя ад забудоў.

**Паводле БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Завалім кансервамі Афрыку

Быхаўскі кансервавагароднінасушыльны завод збіраецца прадаваць прадукцыю ў Афрыку. Прадпрыемства працуе пад гандлёвай маркай «Хозяинбарин». Ужо хутка кансерваваны зялёны гарошак зможа парадаваць насельніцтва Беніна, а пасля і жыхароў суседніх краін.

### Расійскім свінням — не

Беларусь увяла часовыя абмежаванні на ўвоз з Расіі свініны і прадуктаў яе перапрацоўкі. Прычына — пагаршэнне сітуацыі з афрыканскай чумой свіней. Праўда, як зазначаюць у Мінсельгасхарчы, пастаўкі мяса і былі невялікія.

### Перчык у Беларусі

У бліжэйшы час будзе заключана дамова аб ліцэнзійнай або кантрактнай вытворчасці гарэлкі ўкраінскай кампаніі Nemiroff у Беларусі. Прадстаўнікі кампаніі ўжо агледзелі беларускія заводы. Nemiroff, чыім гандлёвым сімвалам з'яўляецца перчык, імпартуе ў Беларусь каля 5 тыс. дал гарэлачнай прадукцыі за год.

### Украіна застанецца без дапамогі

Міжнародны валютны фонд прыпыняе фінансавую дапамогу Украіне. У час перадвыбарчай гонкі ўлада адышла ад курса, прапанаванага МВФ. У прыватнасці, прэзідэнт Украіны Віктар Ющанка падпісаў закон аб сацыяльных стандартах. Краіна можа недаатрымаць $3,8 млрд. Узнаўленне працы магчымае толькі пасля правядзення прэзідэнцкіх выбараў, прызначаных на бліжэйшы студзень.

**ЯМ**

# Вірус падклаў свінню

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Свіны грып ужо стаў палітычным феноменам. Ва Украіне эпідэмію ператварылі ў інструмент перадвыбарнай барацьбы. Але факт і тое, што Кіеў без ваганняў звярнуўся па міжнародную гуманітарную дапамогу.

Нават Абама абвесціў свіны грып агульнанацыянальным бедствам ЗША. Беларускае ж начальства заклапочана, каб не пахіснулася сакральная, ператвораная ў ідэалагічны фетыш стабільнасць.

Адсюль падпіскі аб неразгалошванні для дактароў, цкаванне прэсы, няўцямны пыкмык службовых асоб. Асобнае пытанне, чаму ў краіне раскошных лядовых палацаў так слаба з пігулкамі ды марлевымі павязкамі. Канечне, пры такой паніцы ніякіх запасаў не хапіла б. Але чаму народ панікуе? Бо памятае Чарнобыль, дэвальвацыю, калі ўлада пудрыла мазгі, а потым гэта вылазіла бокам.

Галоўны папрок — нават не за тое, што лекаў ды шпітальных ложкаў мала. Абурае невыкараняльны рэфлекс вярхоў: найперш рабіць добрую міну.

Зараз спахапіліся: шыла ў мяху не ўтоіш. Аднак службовыя асобы выглядаюць неперакананча. Эфект ад іх рыторыкі: усё пад кантролем, вінаваты журналісты і г.д. — адваротны. Заява чыноўніцы Мініінфармацыі, вытрыманая ў саўковай стылістыцы («пресекать попытки дезинформировать»), толькі дыскрэдытуе ўладу. Народ успрымае такія вокрыкі адназначна: ад нас хочуць утаіць праўду!

Апарат улады не навучаны культурна і пераканаўча размаўляць з грамадствам (і нават не разумее, што гэта яго абавязак). Ён можа ці грузіць прапагандай, ці палохаць карамі. Але тут не той выпадак, каб падвышаць голас.

У шпіталях, аптэчных чэргах бэсцяць начальства хатнія гаспадыні, заклапочаныя матулькі, пенсіянеры ды іншыя прадстаўнікі «цвёрдага электарату». Страх за жыццё — наймагутнейшы чыннік палітызацыі. Ужо тут хлусню і замоўчванне абывацель не даруе.

Галоўны начальнік сам гадаваў гэтыя містычныя спадзевы на мудрага цара, гэты агрэсіўны патэрналізм, убіваючы ў галовы, што ад яго ў гэтай краіне залежыць усё. Чаму ж ён маўчыць зараз? — думае просты люд.

Па логіцы рэчаў Лукашэнка мусіць склікаць экстранную нараду і даць разгон чарговай групе «лайдакоў». Піяраўскі спектакль дапаможа выпусціць пар. Ды і грыпозная навала некалі ж пройдзе.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Міністр аховы здароўя Васіль Жарко: усё пад кантролем.**

Але свіны грып — гэта ілюстрацыя нечаканага для ўладаў выкліку. Для савецкага кіраўніцтва такім выклікам стаў Чарнобыль — і нават перабудоўшчык Гарбачоў тэст на галоснасць праваліў.

Для Беларусі Лукашэнкавай эпохі выклікамі сталі ўжо выбух ля стэлы, фінансавы крызіс, дэвальвацыя, паніка ў звязку з наступам новага вірусу... Ад выклікаў не застрахаваная ніводная краіна. Але ў айчыннай сітуацыі мы кожны раз бачым яшчэ і анахранізм сістэмы, зарыентаванай на прапагандысцкую туфту. Таму кіроўная вярхоўка спатыкаецца, тармозіць, недаравальна спазняецца і робіць неадэкватныя крокі пры кожным форс-мажоры.

Няма паўнавартаснага набору галінаў улады, якія б перакрыжавана сачылі адна за адной. Няма грамадскага кантролю за дзяржапаратам, што перашкаджала б утойваць інфармацыю. Няма нармальнай медыясферы, якая б высвечвала маштаб праблемы без аглядкі на пугу.

Выснова на паверхні. Хранічна хворая сістэма. Дыягназ — паталагічная хлуслівасць. Усё запушчана. І галоўнае — лячыцца не хоча!

# «12 ці 15 прапаноў ЕС можна спакойна прыняць»

**Лукашэнка выхаласціў змены ў выбарчае заканадаўства. Перамога на выбарах застаецца загадзя гарантаванай таму, хто іх арганізуе.**

Па выніках нарады з прыгожай назвай — «па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства» — стала ясна: палітычныя практыкі ў краіне застануцца нязменнымі. Прынамсі, на выбарчых кампаніях 2010–2011 гадоў. Спробы еўрапейцаў схіліць Лукашэнку да дэмакратызацыі зверху не прывялі да поспеху. «Лібералізацыя выбарчага заканадаўства не павінна прывесці да палітычных беспарадкаў і анархіі падчас маючых адбыцца выбарчых кампаній», — так гэта сфармуляваў Лукашэнка.

У прыватнасці, перадвыбарныя сустрэчы будуць праводзіцца выключна ў вызначаных для таго месцах. Звычайна гэта пляцоўкі ненавідавоку, у парках ці на ўскрайку гарадоў. «Трэба раз і назаўсёды астаўбіць, будзь тое ў Гомелі, Мінску ці Брэсце, Бярозе ці ў нейкім сельскім савеце, вызначанае месца. І іншага месца быць не павінна», — сказаў А.Лукашэнка. Гэта значыць, палітычную агітацыю на вуліцы, да людзей, не пусцяць.

У пытанні фармавання выбаркамаў таксама змены ў практыцы не гарантаваныя. Вось як Лукашэнка выхаласціў прапановы фармаваць выбаркамы так, каб не менш за трэціну іх складалі прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх арганізацый: «Я наогул не бачу праблемы ў гэтым пытанні. Калі ласка, на месцах ёсць партыі, аб'яднанні. Ідзіце ў райвыканкамы, дзе прымуць рашэнне і ўключаць вас у выбаркамы. Але сілай прымушаць уключаць трэціну ці палову не трэба». Між тым, пры дэмакратыі заўжды апазіцыя мае ўдзел у камісіі і правярае падлік галасоў.

Што да магчымасці назіраць за падлікам галасоў — а гэта ключавая ўмова даверу да вынікаў, — дык «старшыня камісіі ў нас на месцы вырашае, як назіраць, у якім куце стаяць. Калі мы тут будзем прымаць нейкае рашэнне, то гэта ўжо будзе ціск і нівеляванне таго падыходу, які сёння існуе».

Напярэдадні выбараў у палату прадстаўнікоў Лукашэнка гаварыў літаральна тое самае, дадаючы: старшыня камісіі будзе «адказны за вынікі». Так што і тут у рэальнасці нічога не зменіцца.

У астатнім Лукашэнка не бачыць перашкодаў для рэалізацыі прапановаў Еўрасаюза: «Нядаўна, падчас сустрэчы з прадстаўнікамі ЕС, я сказаў, што ў нас няма абсалютна ніякай алергіі і адпрэчвання тых прапановаў, якія ўносіць ЕС», — сказаў А.Лукашэнка. Паводле Лукашэнкі, «нам трэба няшмат часу, і гэтыя 12 ці 15 прапановаў ЕС можна спакойна прыняць, без шкоды для нашай краіны, нашай унутранай палітыкі», толькі з улікам усяго вышэй адзначанага гаворка ідзе аб прыняцці адно на словах.

Астатняе было чыстай вады прапагандай: «Мы не супраць, дзякуй, што падказваеце», але ўсё робіцца, робіцца «дзеля сябе, дзеля народа, для ўнутранай палітыкі, каб не дэстабілізаваць становішча».

**Мікола Бугай**

# Ацэнка рэсурсу

**14 лістапада пройдзе «Еўрапейскі форум» — вялікі збор прыхільнікаў Мілінкевіча.**

Даваць памяшканні ў апошні момант для з'ездаў партый ці грамадскіх форумаў становіцца звычкай для мінскіх чыноўнікаў. Арганізатары «Еўрапейскага форуму» таксама па стане на аўторак адусюль атрымалі толькі адмовы.

Намеснік лідэра Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч кажа: «9 лістапада мы правялі перамовы ва Упраўленні ідэалогіі Мінгарвыканкама. Нам там сказалі, што дапамагаць з пошукам памяшкання не будуць, але параілі дамовіцца з уладальнікамі ўстановаў. У той самы дзень мы накіравалі паўторныя лісты ў канцэртную залю «Мінск», кінатэатр «Кастрычнік», Палац культуры МАЗа. Пакуль адказаў ніадкуль не было».

Дэлегатамі Форуму вылучаныя больш за 1200 чалавек, таму невялікае памяшканне змясціць усіх удзельнікаў відавочна не зможа.

«Мы прынялі рашэнне заклікаць людзей збірацца на Кастрычніцкай плошчы ў 10:00 14 лістапада. Калі праблема з памяшканнем вырашыцца, то будзем іх накіроўваць туды, калі не, то гатовыя правесці яго на вуліцы», — дадае Ю.Губарэвіч.

Чакаецца прыезд замежных гасцей з Еўрапарламента, Еўрапейскай Народнай Партыі, парламентаў Польшчы і Літвы.

Пакуль не да канца ясныя мэты, якіх хочуць дасягнуць на Форуме. «Мерапрыемства праводзіцца, каб ацаніць нашы людскія рэсурсы, стан, перспектывы. У канцы форуму будзе прынятая рэзалюцыя далейшых дзеянняў. Напрыканцы мяркуецца выніковы выступ Аляксандра Мілінкевіча», — кажа намеснік старшыні Руху «За Свабоду».

Губарэвіч падкрэслівае, што ніякіх пастановаў адносна бліжэйшых выбараў прымацца не будзе. «Мы хочам правесці трошку шырэйшае, чым чыста палітычнае мерапрыемства. Будуць працаваць тры секцыі на тэму палітыкі, эканомікі і грамадства». Сам Мілінкевіч яшчэ не пэўны, ці будзе ўдзельнічаць у наступных выбарах.

Форум пройдзе напярэдадні рашэння Еўрасаюза аб падаўжэнні ці прыпыненні санкцый супраць беларускіх чыноўнікаў. Яно будзе прымацца 16 лістапада ў Брусэлі. Таму зрываць працу мерапрыемства, як лічыцца, нявыгадна для ўладаў.

**ЗП**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскія відэа і фоты. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Нешта з небам у нас не тое

**Пад Мінскам здзейсніў аварыйную пасадку верталёт. Гэта пяты за няпоўныя два тыдні інцыдэнт з авіятэхнікай у Беларусі.**

Пад Мінскам 4 лістапада здзейсніў аварыйную пасадку верталёт з членамі камісіі Міждзяржаўнага авіяцыйнага камітэта (МАК) па расследаванні акалічнасцяў катастрофы самалёта ВАе-125-800 Hawker, якая адбылася 26 кастрычніка.

Як паведамілі ва Упраўленні ўнутраных справаў на транспарце МУС, 4 лістапада ў Мінскі аддзел унутраных справаў на паветраным транспарце ад кіраўніка палётамі РУП «Белаэранавігацыя» паступіла паведамленне, што ў 16.08 у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» абвешчана аварыйная трывога. Прычына — вымушаная пасадка верталёта КА-26, які належыць ТАА «Холикоптер». Верталёт аблятаў месца падзення паветранага судна расійскай авіякампаніі «С-Эйр», калі ў яго адбылося падзенне ціску масла ў рухавіку.

У 16.09 верталёт шчасліва сеў на поле ля пасёлка Сокал. Пацярпелых няма. На борце верталёта знаходзіўся адзін член экіпажа, дырэктар ТАА «Холикоптер» і тры члены камісіі МАК: начальнік аддзела па расследаванні авіяцыйных здарэнняў (РФ), інжынер інспекцыі па бяспецы палётаў Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі і старшыня Беларускай лекарска-лётнай экспертызы, паведамляе БелаПАН.

Гэта ўжо пяты інцыдэнт з авіятэхнікай у Беларусі за два няпоўныя тыдні.

**МБ**

**23 кастрычніка** прыватны амерыканскі самалёт Falcon 2000, што выконваў чартэрны рэйс па маршруце Масква — Мінск, здзейсніў аварыйную пасадку ў пункце прызначэння — аэрапорце «Мінск-1». Пры ўзлёце з аэрапорта Дамадзедава не зачынілася створка шасі. На борце знаходзіліся сямёра пасажыраў і тры члены экіпажа. Пацярпелых не было.

**26 кастрычніка** непадалёк ад Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» разбіўся самалёт расійскай авіякампаніі «С-Эйр» з двума пасажырамі (у тым ліку кіраўнік авіякампаніі) і трыма членамі экіпажа.

**29 кастрычніка** ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» здзейсніў аварыйную пасадку самалёт бізнэс-класа Cessna 56X нямецкай авіякампаніі Windrose Air, які ляцеў з Варшавы ў маскоўскі аэрапорт Унукава. На борце знаходзіліся чатыры пасажыры (грамадзяне Польшчы) і тры члены экіпажа (грамадзяне Германіі). У 20.35 аварыйныя службы аэрапорта былі ўзнятыя па трывозе ў сувязі з разгерметызацыяй салона. Вымушаная пасадка была паспяхова здзейснена ў 20.52.

**31 кастрычніка** за 200 метраў ад беларуска-польскай мяжы ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці разбіўся верталёт польскіх памежнікаў. Усе трое членаў экіпажа загінулі.




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Педафілія на «Беларусьфільме»?

**По падазрэнні ў здзяйсненні распусных дзеянняў у дачыненні да непаўналетніх затрыманы рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» Аляксей Туровіч.**

Пра гэта паведаміў памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашоў. 4 лістапада пракуратурай Фрунзенскага раёна была заведзена крымінальная справа паводле ч.1 арт. 169.

Следчыя мяркуюць, што ад лютага 2007 да красавіка 2009 г. рэжысёр у сябе дома здзяйсняў распусныя дзеянні ў дачыненні хлопчыкаў.

Пакуль яму ў віну ставяцца тры эпізоды, паведамляе БЕЛТА.

Актор, рэжысёр, прадусар, сцэнарыст Аляксей Туровіч нарадзіўся 17 сакавіка 1959 г. у Глыбокім Віцебскай вобласці.

Вырас без бацькоў у інтэрнаце. У 1994 г. скончыў школу-студыю на базе кінастудыі «Беларусьфільм».

Зняў такія фільмы як «Турма для кума» (2003), «Сынок» (2007), «Яблык месяца» (2008). Ролі ў кіно: «Перакрыжаванне» («Перекресток») (эпізод), «Паскораная дапамога 1», «Настасся Слуцкая», «Franz+Polina», «Ліст Феліні».

Аляксей Туровіч таксама з'яўляецца генеральным дырэктарам прадпрыемства «Торг-Вестынг». На парламенцкіх выбарах 2008 года балатаваўся ў дэпутаты.

7 жніўня 50-гадовы актор і рэжысёр быў затрыманы на сваёй «Таёце» на выездзе з Мінска. Супрацоўнікі міліцыі абшукалі яго паводле ананімкі на захоўванне наркотыкаў, але нічога не знайшлі.

**Паводле «Салідарнасці»**

## Выйшаў першы нумар «Піўной газеты»

**Выдаўцы чэсна папярэджваюць на першай жа старонцы — празмернае ўжыванне піва і чытанне газет шкодзіць здароўю!**

«Піўная. Газета пра піва і пад піва» афармленнем нагадвае польскі «Fakt», зместам і характарам — гумарыстычную газету «Навінкі», што выходзіла ў Мінску ў канцы 1990-х—пачатку 2000-х.

«Спадзяюся, што хутка будзем у шапіках», — поўніцца аптымізмам галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Пакуль газета будзе выдавацца двойчы на месяц і прадавацца праз прыватных распаўсюднікаў. Наклад «Піўной» — 5100 асобнікаў.

Сярод тэмаў нумара — змены ў Адміністрацыйным кодэксе, заклікання забараніць распіццё піва на вуліцах; забарона продажу піва ў шапіках. «Вернем піва ў кіёскі і павільёны!» — рашуча заклікае першы нумар «Піўной». Калі ўслед за стварэннем газеты яе выдаўцы наважацца аднавіць дзейнасць Партыі аматараў піва, такія заклікі на чарговых выбарах прыцягнуць да іх немалы адсотак прыхільнікаў.

Новае выданне зарэгістраванае Міністэрствам інфармацыі ўлетку. Гэта першае за доўгі час зарэгістраванае незалежнае выданне. Тым часам новыя рэгіянальныя газеты «Магілёўскі час», «Салігорск Плюс» ды «Мар'інагорская» дагэтуль чакаюць ад міністэрства адказу.

**Сямён Печанко**

## Даказваць, што крыва пастрыглі

**Прыйшлося жыхарцы Гродна пасля жудаснага паходу ў цырульню.**

Калі б жыхарка Гродна ведала, чым скончыцца яе паход у салон прыгажосці, яна б сто разоў падумала, ці трэба ёй такія прыгоды на пазногці.

Жыхарка Гродна Соф'я (імя зменена, бо суд па справе не скончыўся) вырашыла зрабіць сабе манікюр. Па яе словах, майстар у салоне прыгажосці «Надзея» зрабіла няякасную працу на сямі пальцах. Калі ж спажывец папрасіла кнігу скаргаў, ёй прапанавалі альтэрнатыўнае рашэнне. Своеасаблівую вусную дамову — маўляў, вы не пішаце скаргу, а мы не возьмем з вас грошы, бо праца сапраўды не надта добрая. На тым і паразумеліся.

Але на наступны дзень супрацоўнікі цырульні адшукалі яе па тэлефоне і сказалі: «Мы перадумалі — прыходзьце і плаціце». Соф'я не пайшла ў салон, а праз некалькі дзён ёй патэлефанавалі з міліцыі. Аказваецца, дырэктарка салона, Таццяна, вырашыла атрымаць грошы праз суд. Спажывец атрымаўся вінаватым. Соф'я ўсё ж напісала скаргу на цырульнікаў. У адказе дырэктарка прызнала сябе вінаватай, а пасля адмовілася і ад пазову.

— Але цяпер я падала пазоў і патрабую маральнай кампенсацыі. Апошні месяц я нават не магла схадзіць у іншы салон і нарэшце зрабіць сабе манікюр, бо яны лічыліся «рэчыўным доказам», — кажа Соф'я.

«Наша Ніва» вырашыла даць слова і другой удзельніцы канфлікту. На жаль, дырэктарка салона ад каментароў адмовілася:

— Я не лічу патрэбным штосьці казаць. У мяне ёсць больш важныя справы, — адказала Таццяна.

У Гродзенскім таварыстве абароны правоў спажыўцоў, куды звярнулася Соф'я, развялі рукамі — аказваецца, у Беларусі няма экспертаў, якія маглі б даць заключэнне, ці якасна аказаныя цырульніцкія паслугі!

Інфармацыю пацвярджаюць і ва Упраўленні абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю: «Ліцэнзіі на экспертныя паслугі могуць выдавацца, але так атрымалася, што ніводнага эксперта ў краіне няма. Таму мы прапануем спажыўцам звяртацца ў любую іншую цырульню, дзе майстар найвышэйшай катэгорыі можа ацаніць, ці якасна была зроблена паслуга. Прычым эстэтыка ацэньвацца не будзе. Калі цырульнік няправільна зразумеў, як вы хацелі пастрыгчыся, але выканаў сваю працу акуратна, юрыдычных прэтэнзій да яго быць не можа».

**Ягор Марціновіч**

## Легендарная тэнісістка чакае першынца



Наталля Зверава хутка стане мамай. Гэта было бачна кожнаму, хто сустрэў знакамітую беларускую тэнісістку на святкаванні дня народзінаў Вольгі Барабаншчыкавай.

Сама Зверава ад каментароў адмаўляецца.

Наталля Зверава ўваходзіла ў пяцёрку найлепшых тэнісістак свету, за сваю кар'еру яна выйграла 18 турніраў Вялікага Шлема ў парным разрадзе (пры гэтым чатыры разы яна перамагала на Уімблдоне). На Алімпійскіх гульнях 1992 г. заваявала бронзу ў пары з Лейлай Месхі. Кар'еру завяршыла ў 2002 г.

**«Салідарнасць»**

# «Больш дэзерціраў не будзе, бо Лукашэнка ўзаконіў прыбыткі чыноўнікаў»

«Час удзелу інтэлігенцыі ў палітычнай барацьбе прамінуў», — кажа пісьменнік **Уладзімір Някляеў**.

**«Наша Ніва»: Апошнім часам было шмат размоваў, што Вы можаце стаць магчымым кандыдатам на прэзідэнцкіх выбарах. Сапраўды, збіраецеся ўдзельнічаць?**

**Уладзімір Някляеў:** Была група людзей, якая мела да мяне падобную прапанову. Але я адразу адмовіўся, бо не мая гэта справа ва ўсіх сэнсах. Не мая, бо мая — гэта літаратура, дзякуй Богу, што хоць цяпер гэта зразумеў, а не прэзідэнцтва ці нейкае іншае начальніцтва. Па-другое, не бачу ніякай патрэбы асабіста ўдзельнічаць у гэтых выбарах. Я не з'яўляюся той асобай, якая б выглядала мацней за цяперашніх палітыкаў. Ну, я, можа, магу грамчэй за іншых сказаць, больш імпульсіўна выступіць, але гэта нічога не азначае. Рыхтуецца ўдзельнічаць Мілінкевіч. І дарма ён кажа, што яшчэ не вызначыўся са сваім удзелам. Не трэба блытаць людзей. Сваімі развагамі ты ўжо некалькіх людзей адштурхнуў ад сябе. Мілінкевіч не знаходзіцца ў сітуацыі Лукашэнкі і не можа сабе дазволіць казаць, што ён так наеўся ўлады, што ванітаваць хочацца.

**«НН»: А ўвогуле як паставіліся да стварэння «Беларускага незалежніцкага блока»?**

**УН:** Чамусьці ўсе накінуліся на гэтых хлопцаў, а я не разумею чаму. Вось былы старшыня БНФ крычыць, што яны здраднікі, але я не бачу прычын выказваць такія моцныя эпітэты. У тым ці іншым фармаце, але гэта б усё адно адбылося б. Дык лепш у гэтым. Мой сябрук Баршчэўскі, стаўшы лідэрам партыі, увесь час спрабаваў сябе выявіць як моцная асоба. Палохаў там усіх, некага выганяў. У выніку каго выгналі?

**«НН»: Міхалевіча.**

**УН:** А цяпер каго? Яго самога выгналі. А Мілінкевіча хто-небудзь выгнаў? Не. А ён нікога і не пужаў. З гэтага можна зрабіць выснову, што Мілінкевіч больш моцны палітык за Баршчэўскага. Мілінкевіч насамрэч не слабак, гэта вонкава ён выглядае на нейкага інтэлігенціка. Тыя ж падзеі ў БНФ, хай Лявон не крыўдуе, але вядуць да лепшага. БНБ надта неаднародная кампанія, але яны разам. І ў значнай ступені таму, што Мілінкевіч няслабая палітычная фігура. Гэта ягонымі сіламі аб'яднаная прагматычная моладзь.

**«НН»: І як Вам гэтая моладзь?**

**УН:** Гэта не рамантыкі часоў Зянона Пазняка. Гэта людзі, якія ведаюць, чаму яны ў палітыцы і што ад яе яны хочуць. Яны хочуць праз гэта нешта мець. Гэта раней гаварылі: «Як толькі я пабачу Беларусь пад бел-чырвона-белым сцягам, дык адразу памру». У мяне спадзяванні на гэтую функцыянальную моладзь. Дзякуючы ім, у нас можа з'явіцца рацыянальная надзея, а не рамантычная. І хвароба росту, і змены людзей, і ратацыя ў кіраўніцтве апазіцыі — гэта абсалютна неабходныя рэчы. Моладзь лепш адукаваная, лепш арганізаваная і лепш за нас усведамляе, чаго канкрэтна яна хоча. Не абстрактнага для Радзімы, для космасу, а канкрэтна для сябе,

Магу запэўніць як чалавек, які досыць добра ведаў Лукашэнку: няма ў ім апантанай антыбеларускасці.

для Мілінкевіча, для Януковіча.

**«НН»: Увогуле, з'яўленне кандыдата ў прэзідэнты з творчай інтэлігенцыі магчымае?**

**УН:** Не. Усё, што магла зрабіць творчая інтэлігенцыя ў нацыянальным адраджэнні, яна зрабіла — Быкаў, Пазняк, Барадулін, мастакі. Тут спачатку нікога не было, апроч інтэлігенцыі. Палітыкі ўжо далучыліся пасля. Але час удзелу інтэлігенцыі ў палітычнай барацьбе прамінуў. Трэба гэта ясна разумець. Цяпер не павінна быць, як было ў нас. Вось я пайшоў, сцягам памахаў, нас трошку палкамі пабілі, а пасля прыйшоў дадому і пачаў вершы пісаць. Палітыка — гэта сістэмная праца, якая патрабуе аддачы такой самай, як і творчасць. Вось чаму Мілінкевіч выглядае лепш за іншых. Ён трымае і ў Руху «За Свабоду», і ў БНБ дысцыпліну. Ён не дае асабліва нікому спяваць тыя песні, якія нехта прыдумаў з вечара, а з раніцы новыя.



**«НН»: Вам бы каго хацелася бачыць кандыдатам у прэзідэнты?**

**УН:** Асабіста я б хацеў бачыць контркандыдатам Аляксандра Лукашэнкі Зянона Пазняка. Нічога больш вартага для сапраўднага тэатра асабіста я прыдумаць не магу. Магу сёння сказаць, што гэтыя выбары пройдуць так ціха, як ніводныя папярэднія. Ніякай надзеі не будзе. Мінулыя выбары ў нейкай ступені далі надзею таму, што там удзельнічала такая яркая асоба як Аляксандр Уладзіслававіч Казулін.

**«НН»: А якая цяпер палітычная перспектыва ў Казуліна?**

**УН:** Наўрад ён зараз пойдзе на выбары. Я думаю, што ён вельмі пакрыўджаны, і пакрыўджаны справядліва. Яму галаву адбівалі, у турму пасадзілі, а мы ўсё разбіралі, ці ён стаўленік Крамля, ці стаўленік

Казулін унікальны чалавек, але не з жалеза.

Лукашэнкі. Ён дасягнуў прыняцця рашэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, чаго ніводны палітык не дамагаўся. Цяпер вось ён спрабуе арганізаваць такую простую рэч, як культурніцкі рух «Беларускі дом», і зноўку ўсе спрабуюць ставіць яму палкі ў колы. Яго здароўе падкасіла нават не турма, а крыўда. У таго ж Андрэя Клімава таксама на вачах мяняецца псіхалогія. Клімаў сёння ўжо не пойдзе рабіць рэвалюцыю. І Казулін, і Клімаў прайшлі праз калонію, мы не можам іх папракаць, бо яны прайшлі праз гэта сваім хрыбтом і галавой. Гэта ўнікальныя людзі, але яны не з жалеза.

**«НН»: А ці можа нехта кінуць выклік Лукашэнку з сённяшняй наменклатуры?**

**УН:** Абсалютна беспадстаўныя чаканкі. Лукашэнка ўзаконіў прыбыткі чыноўнікаў. Ён сказаў: рабяты, хопіць мяне дурыць і ездзіць на Канары адпачываць праз Тулу, а бярыце свае грошы. Таму больш дэзерціраў з наменклатуры не будзе. Калі сёння я ва ўладзе і маю ад яе ўсё, што хачу, то навошта мне ад яе адколвацца? Няўжо можна сабе ўявіць, што нехта зараз адтуль рвецца ў апазіцыю? Не. Ёсць, канечне, рызыка, што можна трапіць у турму за нейкі хабар. Але галоўнае — слухаць бацьку, як спявае мой прыяцель Толя Ярмоленка.

**«НН»: Кажаце, што шанцаў на перамогу пакуль няма, дык што рабіць у такой сітуацыі апазіцыі?**

**УН:** А тое, што яна робіць — проста існаваць і быць апазіцыяй. А што яшчэ можна рабіць? Я не кажу, што ў нас апазіцыя лянотная. Памойму, усё робіцца ёй у тых межах, у якіх гэта магчыма рабіць. У мяне прэтэнзій да дзейнасці апазіцыі няма. Вось цяпер мы бачым нейкі зрух у бок беларускай мовы. Што, без існавання апазіцыі хіба такое магло здарыцца? Каб мне хто сказаў, што ў выніку майго ўдзелу ў выбарах пачнецца беларусізацыя, то пайшоў бы заплюшчыўшы вочы.

**«НН»: А вы верыце ў гэтую беларусізацыю, што нібыта пачынаецца?**

**УН:** А чаму не! Лукашэнка бачыць, што націсканне на гэтыя кнопкі беларусізацыі выклікае такую нервознасць, з якой можна стрыгчы купоны. Вы не чакалі, што я магу націснуць на гэтыя кнопкі, а я магу. Магу запэўніць як чалавек, які досыць добра ведаў Лукашэнку: няма ў ім апантанай антыбеларускасці. Няма! Ён адмовіўся ад беларусізацыі толькі таму, што яна ніяк не дапамагала яму ўтрымліваць уладу. Цяпер гэтай уладзе ўжо нічога не пагражае, і чаму б не звярнуцца да беларускай мовы і культуры.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Уладзімір Някляеў**

нарадзіўся 9 ліпеня 1946 у горадзе Смаргонь. Паэт, празаік, эсэіст. Быў старшынёй Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага ПЭН–цэнтра. Цяпер адзін са стваральнікаў руху «Беларускі дом».




















ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ



АЛЯКСЕЙ ВАЛАБУЕЎ

# Няблізкая Эстонія

**Маленькая ўсходнееўрапейская нацыя здолела за кароткі час збудаваць паспяховую дзяржаву. Не верыцца, што дваццаць гадоў таму мы жылі ў адной камуналцы. Піша Зміцер Панкавец.**

Мы ведаем пра Эстонію з расійскіх прапагандысцкіх сюжэтаў. Яны ж чулі пра Лукашэнку. Вось і ўсё.

Шэнгенскія візы спрасцілі шлях у Эстонію, але гэтая балтыйская краіна застаецца па-ранейшаму загадкай для беларусаў. Не верыцца, што яшчэ дваццаць гадоў таму нашы народы былі вымушаныя жыць у адной дзяржаве.

## Бярыце прыклад з беларусаў

Мы ехалі ў Талін машынай. На беларуска-латышскай мяжы побач з Браславам пустынна. Некалькі фураў, парачка легкавых. Гэта не самы папулярны пераход. Беларускія памежнікі за апошнія гады пачалі яўна выйграваць у сваіх калег. Праверка дакументаў і надгляд праходзяць аператыўна і ветліва.

Не сказаць, што латышы горшыя, але правяраюць нашмат даўжэй. Адзін з памежнікаў пытаецца: «Ад свінога грыпу ўцякаеце?» — і смяецца.

Латвія пранеслася за вокнамі аўто незаўважна. Пачынаецца Эстонія, з яе лясамі, рэчкамі, хутарамі. Яшчэ да Тарту перад машынай на дарогу выскачыў лось, пасля казуля. Цуд некранутай прыроды.

Тарту — другі па велічыні горад Эстоніі. Тут жыве крыху больш за сто тысяч чалавек. Як у Пінску. Да іх прыплюсуйце студэнтаў: у Тарту адзінаццаць універсітэтаў!

Вучацца тут і беларусы. Эстонія — адна з нямногіх краін Еўропы, якая падтрымала адукацыйную праграму Каліноўскага. У першы год навучацца прыехала дзесяць студэнтаў, у другі — пяць. Засталіся не ўсе: нехта займаўся круцяльствам, хтосьці «не пацягнуў» вучобу. Але большасць утрымалася. Імі выкладчыкі задаволеныя.

Першы год замежныя студэнты ў Тарту вывучаюць эстонскую мову, гісторыю, культуру, іх возяць па краіне. А ўжо на наступны год студэнты разыходзяцца па ўніверсітэтах.

Прычым, адукацыю можна атрымліваць не толькі па-эстонску. Не праблема і па-расійску (што абвяргае міф аб адсутнасці расійскамоўнай адукацыі), і па-англійску. Беларусы звычайна выбіраюць два апошнія варыянты. Бо вывучыць нават за год эстонскую мову, з яе адсутнасцю прыназоўнікаў і мноствам склонаў, няпроста.

Зрэшты, адну беларускую студэнтку з Тарту, якая дасканала вывучыла эстонскую, ставіў у прыклад сам прэзідэнт Ільвес, адказваючы на закіды маскоўскіх журналістаў.

## Такімі былі ганзейскія гарады

Па дарозе з Тарту ў Талін не сустрэнеш буйных селішчаў. Хутары, хутары, хутары... Стаіць такая ўтульная хатка пасярод поля, абсаджаная яблынямі. Нават за саветамі хутаранства не змаглі выкараніць, не выйшла калектывізаваць эстонцаў.

За ўвесь час бачыў толькі адну закінутую калгасную ферму. А палеткі ўсе дагледжаныя і ўзараныя. З Літвой не параўнаеш. Побач з дамамі стаяць трактары і легкавікі. Платоў амаль няма. Навошта — калі сусед жыве за кіламетр?

Дарога з Мінска да Таліна машынай займае каля чатырнаццаці гадзін. Але ўбачанае вартае такой паездкі. Талін зачароўвае з першага погляду.

Яшчэ воддаль гістарычнага цэнтра прыцягвае ўвагу гарадская архітэктура. Драўляныя двухпавярховыя будынкі. У некаторых і сёння няма цэнтральнага ацяплення, печы і каміны паляць дровамі. Шматпавярховікаў мала.

Высачэзны сабор Святога Олафа найлепш бачны з адлегласці. У сярэднявечнай Еўропе гэта быў найвышэйшы будынак — 124 метры. Пабудаваны яшчэ ў XIII стагоддзі. Увогуле, будынкаў таго перыяду ў эстонскай сталіцы засталося шмат.

Мясцовыя жыхары кажуць, што ім пашанцавала болей за Рыгу, бо Талін быў звычайным правінцыйным гарадком Расійскай імперыі, і ўсе гэтыя будынкі мала каго перайма́лі. А вось у Рызе шмат што пабурылі, каб горад не выглядаў занадта «нямецкім».

Старое места невялікае — квадратны кіламетр — але паглядзець ёсць на што. Такімі былі ў Сярэднявеччы ганзейскія гарады. Ратуша на цэнтральнай плошчы, пабудаваная ў XV ст. Побач раскінутыя яткі, дзяўчаты ў нацыянальных строях прадаюць печыва з імберцам. Пах імбіру і глінтвейну разліваецца па ўсім старым горадзе, немагчыма стрымацца.

Калі не пашкадуеце грошай, можна паабедаць ў сярэднявечным рэстаране Olde Hansa. Там нават няма электрычнасці, гараць паходні.

А крыху вышэй за Ратушную плошчу, на вуліцы Ратаскаэву, ёсць свой дом з прывідамі. Расказваюць, яго гаспадар пусціў з ветрам усё дабро і ўжо збіраўся вешацца. Раптам на парозе з'явіўся незнаёмец, які абяцаў памагчы грашыма, калі здасць на адну ноч другі паверх дома. Адзіная ўмова — ніхто не павінен бачыць, што там будзе. Гаспадар з радасцю пагадзіўся. Увечары да дома пачалі пад'язджаць шыкоўныя карэты, а па лесвіцы чуліся крокі шматлікіх гасцей.

Грошай гаспадар не атрымаў, бо на баляванне ў самы непатрэбны момант зайшоў слуга, які пабачыў вяселле чорта. Слугу нячыстая сіла замуравала ў адзін з пакояў дома, там яшчэ намаляванае акно...

## Дзве нагі і парламент між імі

У Таліне ёсць дзве вуліцы, якія называюцца Вялікая Нага і Малая Нага. Першая вяла з Верхняга горада ў Ніжні, а другая злучала места з портам, па ёй у горад завозілі заморскія тавары. Як жартуе лідэр маладзевага аб'яднання «Адкрытая рэспубліка» Яўген Крыштафовіч, у Таліна ёсць «дзве нагі, а паміж імі — парламент».

Калі ж без жартаў, то ўлада ў дэмакратычнай Эстоніі вельмі маладая. Сярэдні ўзрост эстонскага міністра — 35 гадоў. У нас наймалодшаму з міністраў, Латушку, — 36.

Расійскія выданні не любяць пра гэта пісаць, яны зважаюць на іншае. «Яны не любяць расійцаў, якія ім метро пабудавалі», — так некалі напісала «Камсамолка». Лішне казаць, што «метро» ў Таліне няма.

## Тут здымалі мушкецёраў

Талін, Рыга і Львоў былі гарадамі, дзе рабілі савецкія фільмы пра Захад. У адным з утульных двароў эстонскай сталіцы здымалі культавага «Д'Артаньяна».

Гэтае месца называецца «Дацкі сад». Паводле легенды, тут датчанам з неба зваліўся іх сцяг. Датчане валодалі Талінам у XIII ст., потым горад перайшоў да Тэўтонскага ордэна.

І эстонцы ўвесь час падвышаюць кінематаграфічную каштоўнасць свайго места. Нядаўна на ўскрайку старога горада падчас будаўніцтва падземнай стаянкі знайшлі гарадскія муры. Знаходку, натуральна, пакінулі, але і стаянку зрабілі. Выглядае прыгожа.

На цэнтральнай плошчы Таліна Вабадузе стаіць помнік у гонар перамогі ў Вызваленчай эстонска-савецкай вайне 1918—1920 гадоў — Крыж Свабоды. Шмат хто бачыць у гэтым крыжы нацысцкую геральдыку, але ж узнагарода была распрацаваная яшчэ ў 1919 годзе. У той вайне на баку эстонцаў браў удзел і Асобны атрад пад камандаваннем Станіслава Булак-Балаховіча — будучага камандзіра войскаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Эстонцы не адмяняюць абавязковую вайсковую службу аж да сёння, хоць суседзі ад яе адмовіліся. Занадта моцны фінскі ўплыў. Фінляндыя не ўступае ў НАТО, лічыць, што здольная сама абараніць свае межы. Як у 1940 годзе.

У эстонскую армію існуе нават чарга — паслужыць хочуць усе. У сухапутных войсках тэрмін службы восем месяцаў, на флоце — адзінаццаць.

## Людзі без пашпартоў

Пачуўшы ў Верхнім горадзе беларускую мову, да нас пачаў чапляцца 50-гадовы мужчына. Як даведаўся, што мы з Беларусі, узрадаваўся. Хваліў «Беларускі бальзам», які прадаецца ў Таліне за 80 кронаў (20 тысяч беларускіх). Зычыў поспеху Лукашэнку. А таксама заклінаў не ўціскаць правы расійскамоўных.

Людзей, якія размаўляюць на «вялікім і магутным», у Таліне з чвэрць. Часткай гэта турысты, але хапае і мясцовых. Дзіўная сітуацыя: людзі, якія ўвесь час клянуць Эстонію, не хочуць выязджаць адсюль.

Калі развальваўся Савецкі Саюз, амерыканцы прапаноўвалі вялікія грошы расійскім вайскоўцам, каб тыя змаглі набыць сабе дамы на Радзіме. Мала хто пагадзіўся.

Апошні выпадак — з прапаршчыкам Мікалаем Мікалаенкам. Ён атрымаў ваўчар на набыццё жылплошчы ў Расіі, але адмовіўся туды пераязджаць. Эстонскія ўлады палічылі, што ён страціў права на пражыванне ў краіне і змясцілі яго ў Цэнтры дэпартацыі нелегалаў.

Мікалаенка ж пачаў судзіцца. Усе эстонскія суды прызналі яго неправату, але Страсбургскі суд па правах чалавека ўстаў на абарону прапаршчыка. І Мікалаенка атрымаў яшчэ вялізную маральную кампенсацыю з боку эстонцаў. І працягвае мучыц-

ца ў ненавіснай краіне. Адразу па развале СССР у Эстоніі было аж 500 тысяч чалавек (з 1 мільёна 400 тысяч жыхароў), якія не маглі атрымаць пашпарт грамадзяніна Эстоніі, але і адмаўляліся ад расійскага. На грамадзянства яны не маглі прэтэндаваць, бо ніхто з іх продкаў не меў грамадзянства Эстоніі да 1940 года. Эстонцы лічылі сваю краіну акупаванай ад часоў Другой сусветнай.

Такім асобам выдавалі шэрыя пашпарты неграмадзян. Яны маюць усе тыя самыя правы, што і грамадзяне, апроч галасавання на выбарах у Сойм і Еўрапарламент. Цяпер такіх засталося 100 тысяч.

Яўген Крыштафовіч паўжартам кажа, што ніводны эстонец не можа чыста размаўляць па-расійску. І наадварот. Праблемы з эстонскай мовай мае нават прэзідэнт Ільвес, які пражыў большую частку жыцця ў ЗША.

Крыштафовіч сам — эстонец, хоць мае беларускае прозвішча. Цяпер ён абмяркоўвае з міністрам адукацыі пытанне вучобы ў эстонскім ВНУ для Івана Шылы.

## Расійцаў няма ў парламенце

Арно працуе дарадцам у кіроўнай Партыі рэформ. У свой час ён быў мэрам маленькага эстонскага гарадка, а цяпер дапамагае, чым можа, беларускім студэнтам. Арно кажа, што, нягледзячы на вялікую колькасць расійцаў у краіне, яны не прадстаўлены ў парламенце. У адрозненне, напрыклад, ад Латвіі.

Расійцы Таліна галасуюць за цэнтрысцкую партыю Эдгара Савісаара. У канцы 1980-х гэты чалавек узначальваў Народны фронт Эстоніі, партыю, якая спрычынілася да здабыцця незалежнасці. Нядоўгі час Савісаар нават быў прэм'ер-міністрам.

Цяпер ён мае рэпутацыю абаронцы расійскамоўных і найбяднейшых. «Палітыка Савісаара трымаецца на папулізме, ён хоча адчуваць сябе такім бацькам горада, як Лужкоў. Насамрэч Савісаару проста ў кайф, што за яго цяпер галасуюць расійцы, якія нядаўна яго ненавідзелі», — кажа Арно.

Савісаара ўжо другі раз абіраюць мэрам Таліна, хоць у краіне яго партыя не вельмі папулярная. Яго электаральная група, збольшага, знаходзіцца ў талінскім раёне Ласнамяэ, дзе жыве большасць расійцаў. Цікава, што партыя былога кіраўніка НФЭ мае партнёрскія сувязі з крамлёўскай «Адзінай Расіяй».

Эпапею з пераносам Бронзавага салдата ў Таліне ўжо паспелі забыць. Сведкі кажуць, у беспарадках удзельнічала чалавек пяцьсот. Большасць — раней судзімых. Расказваюць, беларускі консул выбачаўся перад расійскімі дыпламатамі ў прыватнай гутарцы, што не змог «падцягнуць свае сілы».

## Трэцяя па велічыні

Беларусы — трэцяя па велічыні нацыянальная меншасць у Эстоніі. Іх тут ад 15 да 25 тысяч. На вуліцы Вене ёсць мемарыяльная шыльда на будынку, дзе ў 1920—1925 г. знаходзілася Вайскова-дыпламатычная місія БНР.

Ёсць некалькі арганізацый дыяспары. Самая вядомая з якіх БЭЗ (Беларуска-эстонскае задзіночанне). Тут атрымаў палітычны прытулак Павел Марозаў з арганізацыі «Трэці шлях» пасля заведзенай на яго крымінальнай справы за мульцікі пра Лукашэнку.

Цяпер, дзякуючы захадам беларускага кіраўніцтва ў бок Захаду і адкрытасці эстонскіх чыноўнікаў да прэсы, землякі могуць дазнацца цікавыя рэчы пра палітыкаў «метраполіі». Так, міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Паэт па візіце ў Мінск расказаў, што ягоная сустрэча з Лукашэнкам цягнулася больш за дзве гадзіны замест трыццаці хвілін. Упершыню за час сваёй працы дыпламат быў вымушаны перапыніць размову і сказаць, што ў яго самалёт і ён спазняецца.

## Фінляндыю відаць

Ад Таліна да Хельсінкі ўсяго 80 кіламетраў. У яснае надвор'е Фінляндыя бачная проста з талінскай набярэжнай. Паромы ходзяць часта — ехаць усяго дзве гадзіны. Білеты можна знайсці за 30 еўра туды і назад.

Эстонцы шмат у чым арыентаваліся менавіта на фінаў, калі праходзілі шлях ад сацыялізму да капіталізму. Зрэшты, на каго яшчэ арыентавацца, як не на бліжэйшых суседзяў.

## Ці далёка да Таліна?

Ёсць шавіністычны расійскі анекдот пра двух эстонцаў у дарозе: «Ці далёка да Таліна?» — «Яшчэ не далёка». Праз дзве гадзіны: «Ці далёка ж да Таліна?» — «Ужо не блізка».

Так і нам да Эстоніі калі не далёка, дык, прынамсі, няблізка. У пачатку 1990-х, дзякуючы жорсткім эканамічным і палітычным рэформам, Эстонія выйшла ў лідэры рэгіёна. Цвёрда была падрыхтаваная да ўступлення ў Еўрасаюз і НАТО. У краіне пачаўся актыўны рост эканомікі, які прыпыніўся толькі з прыходам крызісу.

Беларусаў рэформы толькі чакаюць. Таму эстонскі досвед, як ператварыцца з постсавецкага абломка ў шыкоўную еўрапейскую краіну, можа быць карысным і патрэбным для нас.

*Талін — Мінск*



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



АЛЯКСЕЙ ВАЛАБУЕЎ

**Хацелі пабудаваць падземны паркінг, а знайшлі сярэднявечныя муры. Знаходку пакінулі, але і стаянку зрабілі.**



АЛЯКСЕЙ ВАЛАБУЕЎ

**Дацкі сад. Паводле легенды, тут датчанам у XIII ст. з неба зваліўся іхні сцяг. А ў Савецкі час на гэтым месцы здымалі «Д'Артаньяна і трох мушкецёраў».**



АЛЯКСЕЙ ВАЛАБУЕЎ

**Праваслаўны сабор Аляксандра Неўскага стаіць насупраць парламента. Праваслаўных эстонцаў усяго 20%.**




АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Курапаты ў Мінску не адны. У нядзелю прайшла акцыя ўшанавання памяці расстраляных НКВД у Лошыцкім яры.**

***

У аднаго былі паводзіны,
Каб у Крэмль зрабіць уходзіны.
А другі імкнецца (марыць) і цяпер
К рукам прыбраць БССР.

**Іван Ярмаліцкі, Мінск**

## Хадановіч сказаў, як у труну паклаў

**Андрэй Хадановіч абвесціў, а «народны чытака» Мікола Бусел яго з удзячнасцю падтрымаў («НН», №40, 2009), што сучасная беларуская літаратура бяззубая.** Паколькі спадар не «шараговы» чытач, а, так бы мовіць, літаратурны палкоўнік ці нават генерал, то і грамадская вага яго публічных ацэнак іншая. Статус вымагае.

Асабліва ў наш час, калі само паняцце «беларуская літаратура» аказалася разарваным на шматкі. Акрамя чаргінцоўцаў, існуе аб'яднанне Беларускі ПЭН-Цэнтр, які сп. Хадановіч і ўзначальвае, а ёсць жа Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП). Дык здабыткі якіх літаратараў, якога аб'яднання ацаніў сп. Хадановіч у сучаснай беларускай літаратуры?

Пра вырабы «чаргінцоўцаў» паведамляюць афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі. А вось ацэньваць здабыткі сяброў СБП, якія мне вядомыя куды лепей, я б не стаў гэтак адназначна, як сп. Хадановіч.

Калі іх творы спрэс «бяззубыя», чаму менавіта члены Саюза беларускіх пісьменнікаў падвергнутыя ўладнаму ціску, амаль як першыя хрысціяне ў Старажытным Рыме, хіба што ў цырку да львоў на сняданак не выштурхоўваюць? Магчымасці зарабіць на хлеб літаратурнай творчасцю пазбаўленыя: у часопісы ходу няма, у дзяржвыдавецтвы таксама, сустрэчы з чытачамі і то заблакаваныя. Навошта б гэтак татальна-люта расправуляцца з «бяззубымі»?

Дарэчы, пра «зубастасць». Што мелася на ўвазе? Сатырычнасць? Дык сатыра — толькі адзін з жанраў мастацкай літаратуры. Дзёрзкасць? Ці адвага высокамастацкім словам казаць праўду, якой бы горкай тая ні была? Адвага выступіць насуперак афіцыйнаму стэрэатыпу, калі той шкодзіць развіццю нацыі? Ці ёсць гэта ў здабытках нашых пісьменнікаў? А вось, на ўскідку.

У жанры мастацкай прозы нельга абмінуць раман-эпапею Васіля Якавенкі «Пакутны век», які літаратуразнаўца Аляксей Рагуля назваў адным з першых паўнацэнных палітычных беларускіх раманаў. Алесю Рыбаку ўдалося нарэшце апублікаваць «Машу і Машку» — адметную аповесць пра нарастанне роспачы, але і стыхійнага супраціву сялян сучаснаму нахабнаму чынавенству. Не супадаюць з замшэлым афіцыёзам новыя п'есы Алеся Петрашкевіча. Згадаем шэраг кароткіх аповесцяў Андрэя Федарэнкі. Ці зусім «новы» раман Наталлі Бабінай «Рыбін горад». А паэзія! А гістарычная публіцыстыка і эсэістыка Ніла Гілевіча, Сяргея Дубаўца, Віктара Казько і творы яшчэ шэрагу літаратараў, якімі магла б ганарыцца любая літаратура свету.

Калі ўжо шаноўны Андрэй Хадановіч пажадаў ахарактарызаваць сучасную беларускую літаратуру, варта было б уважлівей агледзецца наўкола. А то сказаў, як у труну паклаў.

**Эрнест Ялугін, Мінск**

## Моладзь супраць Вялікага Кастрычніка

**На мінулых выхадных моладзь з Глыбокага, Паставаў і Докшыцаў распачала тыднёвую антыкамуністычную акцыю, прымеркаваную да гадавіны кастрычніцкага перавароту 1917 года.** Да акцыі далучыліся больш за дзесятак чалавек. Яны расклейваюць па слупах налепкі з надпісам «Серп і молат — смерць і голад», раскідваюць па скрынях улёткі з інфармацыяй пра колькасць ахвяраў камуністычнага і нацысцкага рэжымаў ды пашыраюць сярод знаёмых зняты фільм «НКВД-Гестапо: браты па крыві», зняты «Белсатам».

Ёсць у гэтым краі, які даў Беларусі Ластоўскага, Дуж-Душэўскага, Буйніцкага ды СБП, нацыянальна свядомая моладзь, якая мае сваю думку і імкнецца супрацьстаяць засіллю БРСМ і дзяржаўнай прапаганды. Шкада толькі, што мясцовыя апазіцыйныя дзеячы зусім не стараюцца падтрымаць гэтае імкненне.

**Глыбоцкі Воўк**

## За каго не моліцца Касцёл

У пераліку мінскіх могілак, на якіх адбыліся каталіцкія набажэнствы на Дзяды, зноў не трапілі Курапаты. Ксяндзы, відаць, баяцца маліцца на месцы, дзе ляжаць парэшткі закатаваных беларусаў, з якіх тысячы каталіцкіх вернікаў, ды, мабыць, і ксяндзоў.

Польскія каталікі нядаўна адзначылі 25-ю гадавіну забойства ксяндза Ежы Папялушкі, якога ў 1984 годзе камуністычныя спецслужбы знішчылі за правядзенне ў Варшаве імшаў за Айчыну. Ужо некалькі гадоў ідзе беатыфікацыйны працэс ксяндза-пакутніка. Беларускі партал Catholic.by абышоў гэтую дату маўчаннем, а ксяндзы наадрэз адмовіліся каментаваць «Белсату» гэтую трагедыю. Маўляў, гэта не мае дачынення да сённяшняй Беларусі.

Мае, яшчэ як мае. Сумленне і памяць, а не палітычная кан'юнктура мусяць вызначаць, дзе і за каго трэба маліцца. Кс. Ежы Папялушка рабіў гэта непахісна і з поўнай адвагай і заплаціў сваім жыццём. У нас бы так не было. Па ўказцы рэжыму каталіцкія іерархі самі паставілі б на месца любога ксяндза ў абмен на абяцанкі запрасіць Папу ды туманны прывід канкардату.

**Янка Зуброўскі, Глыбокае**

## Як у ваду глядзеў

**Падчас нарады, прысвечанай ушанаванню памяці ахвяраў розных рэжымаў на Беларусі, пазнаёміўся з Вацлавам Нямковічам.**

Вацлаў Нямковіч з 1929 года, родам з Браслаўшчыны — з вёскі Гаўрыцы. У 1939 годзе яму было дзесяць гадоў, і дзень 17-га верасня яму запомніўся добра. У ягоную вёску апоўдні ўкаціўся чырвоназорны танк. Людзі высыпалі на вуліцу, каб падзівіцца на гэты самаходны панцыр. Усе чакалі, калі адкінецца танкавае вечка-люк і з яго пакажацца постаць вызвольніка. І от нарэшце высунуўся няйначай камандзір танка. У шлеме. Уладарна агледзеўся вакол і прывітаў усіх. Люд яшчэ больш зашумеў, ажывіўся.

І што крэпка запомнілася — прывітаць вызвольнікаў прыляцелі і тутэйшыя актывісты-камуністы. Прыйшлі з чырвонымі стужкамі-павязкамі на рукавах. Танкіст-вызвольнік і сказаў: «Бачу, у некаторых з вас на рукавах чырвоныя стужкі. Сёння гэтыя стужкі ў вас на рукавах, а заўтра можа так стацца, што іх вам павяжуць на шыю!..»

Мо не ўсе тады зразумелі гэтую рэпліку. А мяне яна вельмі ўразіла. Ды так, што помніцца, як бачыце, да гэтае пары. Дык і напраўду, пасля верасня 1939 года на нядаўна вызваленай Заходняй Беларусі ўсяго было… І арышты, і ссылкі, і муштры…

**Запісаў Уладзімір Содаль, Мінск**

## ВОДГУКІ НА NN.BY

### «Нацыянальны абсурд, або Настальгія па чужынскай уладзе», №40

***

У мяне дзядзька з Заходняй Беларусі пад уплывам камуністычнай прапаганды захацеў перайсці савецкую мяжу. Дзякуй Богу, яго затрымалі польскія памежнікі. Далі 20 бізуноў і два тыдні арышту. Цікава, што зрабілі б з ім сталінскія «сокалы»...

Гэта я да таго, што нямажна раўняць польскую передваенную ўладу і сталінскую.

**НР**

***

Ніводзін з беларускіх палітычных дзеячаў не быў забіты ці даведзены да вар'яцтва альбо самагубства пад палякамі. Беларусы маглі за нешта змагацца, а пад саветамі браць толькі тое, што навязвалася. Пад палякамі беларускае сялянства не знішчалася як сацыяльная група, а значыць, і было з кім працаваць у сэнсе выхавання нацыянальнай свядомасці. Іншая справа, што ў Польшчы беларусы лічыліся самай шэрай, затурканай этнаграфічнай групай.

Спяваючы асану аб'яднанню, не забывайце — была адна абавязковая ўмова — у БССР беларусы ўжо не маглі быць проста беларусамі, яны маглі быць толькі савецкімі беларусамі. Тое, што з гэтага атрымалася, Польшчаю не назавеш, але ці Беларусь гэта?

**Яўген**

***

А.Трафімчык у апошнім «Беларускім гістарычным аглядзе» доўга даказвае, што Беларусь аб'ядналася б і сама ў выніку развіцця нацыянальнага руху. Гляньце на Курдыстан, дзе нацыянальны рух у сто разоў мацнейшы за беларускі, і якому ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі нічога не свеціць. Можна згадаць таксама Краіну Баскаў, Каталонію, Белуджыстан, Сахару туарэгаў, Тамілнад. Яны змагаюцца, але чарговага перадзелу свету не прадбачыцца. Таму, перш чым ныць, трэба глянуць цвяроза — нам пашчасціла, што мы атрымалі дзяржаву на большай частцы этнічнай тэрыторыі. Ды яшчэ чужымі рукамі.

Сапраўды, цана вялікая, як і цана любога людскога жыцця. Але не будзем чапляць на сябе вечны комплекс сталінскай ахвяры. Паўсвету — сталінскія ахвяры. І калі за незалежнасць і адзінства трэба плаціць, то, глянуўшы цвяроза, — мы заплацілі значна менш у параўнанні з усімі суседзямі.

**zmiejavik**

***

Што мы выйгралі як нацыя ад існавання ў сталінскім пекле? Тое, што страцілі дзесяткі тысяч найлепшых людзей у лагерах? Камунізм быў, ёсць і будзе найгоршай формай таталітарных рэжымаў. Параўноўваць аўтарытарную даваенную Польшчу і сталінскі ГУЛАГ — як у вас духу хапіла пісаным словам выступіць з такой бязглуздзіцай?

**Міхаліна**

## Леаніду Акаловічу — 70!

Святар, протаіерэй Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Леанід Акаловіч працуе ў сваіх пастаянных, часовых і вандроўных прыходах — Мінск, Гродна, Магілёў, Віцебск, Гомель, Курапаты, Лошыца, Трасцянец-Благоўшчына, Кальварыя (Мінск), Вілейка, Грозава, Вызна (Чырвоная Слабада), Семежава, Слуцк і іншыя, моліцца за беларускі народ на Чарнобыльскіх шляхах, Ігуменскіх (Чэрвеньскіх) жальбінах, на Крапіўніцкім полі пад Оршай, на Дзяды і Радаўніцу.

Леанід Акаловіч сустракае 70-годдзе поўны сілаў, энергіі і планаў на будучае, намагаецца зрабіць больш карыснага для сваёй Бацькаўшчыны.

Дык пажадаем жа яму ў гэтых намаганнях моцнага здароўя, шчасця і ўсяго найлепшага ў жыцці!

**Анатоль Валахановіч, Мінск**

***

Бесядзь! З глыбіні сваіх вякоў
Ці знойдзеш ты ў сябе крыніцы,
Каб шчэ нарадзіўся новы Пісьмянкоў
І новы Куляшоў палію твае вадзіцы.

**Эльяш Банель, Мінск**

## ШУКАЮЦЬ

Я з Аргенціны, з горада Буэнас-Айрэс. Я шукаю інфармацыю пра род СУШЧЭВІЧ. Маю маму звалі Вольга Сушчэвіч (Olga Suschevich / Suszczewicz). Яна паходзіць з засценка В.Борка (Заастравечча). Гэта недзе ў Заходняй Беларусі.

Калі Вы маеце нейкую інфармацыю пра нашых сваякоў ці радаводы, звяжыцеся, калі ласка, са мной праз электронную пошту па-іспанску ці па-ангельску:

**Carlos Occhiuzzi**
**carzzy2003@hotmail.com**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**



# За Драздовічам палявалі падаткавікі

Ёсць такі цікавы глыбоцкі хлопец Віця, якога на рынку можна сустрэць побач з шыльдай «Куплю ўсялякую непатрэбную вам рэч». І нясуць яму бабулькі «ўсялякую непатрэбную ім рэч». Хто прас, а хто і самавар. Часта ў нас адбываюцца дыскусіі аб каштоўнасці той альбо іншай «непатрэбнай камусьці рэчы».

Раз Віця сказаў, што ў яго ёсць сшытак з малюнкамі самога Язэпа Драздовіча. Запрасіў дадому паглядзець і ацаніць каштоўнасць знаходкі.

Сшытак з малюнкамі адносіцца да 1930-х. Пра тое сведчаць каляровыя алоўкавыя малюнкі польскага сцяга — бела-чырвонага. Ёсць відарысы вайсковых баталіяў: танкі, гарматы, жаўнеры ў канфедэратках. Аднак малюнкі яўна — дзіцячыя. Шмат тут і добрай графікі тушшу, выкананай ужо дарослым чалавекам. Партрэты, краявіды, архітэктурныя помнікі, сярод якіх і Вострая Брама ў Вільні... Перасыпаныя старонкі сшытка вершамі то на польскай, то на расійскай мовах.

— Гэта — не Драздовіч! Драздовіч — беларускі нацыяналіст. Не мог ён, прынцыпова, пісаць вершы на польскай і расійскай мовах! Да таго ж, пад графічнымі малюнкамі, яўна, чытаецца аўтограф — Duliniec,— выказаў аўтар сваё меркаванне.

— Не! Гэта — Драздовіч,— не згаджаецца Віця. — Мне «спецы» казалі.

Можа, Віктар хвілінаў праз дзесяць і перакanaў бы аўтара гэтых радкоў, што тое ёсць Драздовіч. Аднак у нашую спрэчку ўвязаўся цесць Віктара — Канстанцін Пяткевіч.

— Драздовіча я памятаю!

— Неймаверна! Вы бачылі Драздовіча! Дык распавядзіце.

— Жылі мы ў Сасноўцы, гэта побач з Залессем. Ён хадзіў па хатах — ад вёскі да вёскі. У маіх бацькоў начаваў, — кажа Канстанцін Пяткевіч. — Вось за начлег і харчаванне — у якасці платы — маляваў гэтыя дываны. У бабулек прыпеўкі і песні збіраў ды запісваў...



Канстанцін Пяткевіч памятае Язэпа Драздовіча.

Не кожны гаспадар пускаў яго ў хату... Шмат хто лічыў, што ў яго не ўсё з галавой у парадку. А ў маіх бацькоў заўсёды быў прытулак для ўсіх: і жабракам, і Драздовічу таксама.

Свой подпіс «Я. Драздовіч» на карцінах (дыванах) ён ставіў да вайны, пры паляках. Пры саветах ужо не ставіў. Яму забаранілі вось так проста хадзіць па вёсках і маляваць. Сказалі, трэба плаціць падаткі. Між тым, свае работы ён усё ж адзначаў ініцыяламі «Я.Н.» (Язэп Нарцызавіч). Фактычна, хаваў аўтарства. Тады ж усіх абкладалі падаткам за ўсялякую дзейнасць.

У Драздовіча не было ж ніякай майстэрні. Сёння малюе ў адной хаце, заўтра ў іншай. Падаткавікі ж таксама хадзілі па вёсках, шукалі ягоныя маляваныя дываны, каб абкласці падаткам. Знаходзілі іх, але там не было подпісу «Я. Драздовіч». Дый які падатак мог заплаціць жабрак Драздовіч! Маляваў за ежу і начны прытулак...

Наконт гэтага сшытка з малюнкамі... Мог жа Драздовіч заначаваць у Дулінцоў, — працягвае Канстанцін Пяткевіч. — Пакінуў малюнак-другі... А потым у гэтым сшытку з'явіліся вершы і графічныя малюнкі самога Дулінца ды алоўкавыя малюнкі ягонага сына. Магло ж і такое быць?

Я папрасіў пракаментаваць вышэйзгаданыя малюнкі Юрыя Калбасіча, настаўніка Глыбоцкай СШ №2, які скончыў «худграф».

— Гэта — не Драздовіч! — сцвярджае Юрый. — Партрэты сведчаць, што мастак слаба ягчэ ведае анатомію чалавека. Зрэшты, усё гэта можа быць перамалёўкамі з польскіх кніжак 1930-х. Тады ў кнігах было шмат графікі.

**«Вольнае Глыбокае»**



Старонка з загадкавага сшытка. Шмат хто сцвярджае — гэта Драздовіч! Ініцыялы A.D. сцвярджаюць адваротнае.



Так маляваў Драздовіч.

## Узʼяднальны ARCHE

Выйшаў восьмы нумар часопіса ARCHE за 2009 год. Ён прысвечаны 70-годдзю верасьнёўскіх падзей 1939-га.





У яго ўвайшлі тэксты, датычныя гісторыі Заходняй Беларусі, падзей верасня 1939-га, а таксама іншыя цікавыя матэрыялы з гісторыі польска-беларускіх стасункаў. Аўтарамі новага нумара сталі А.Чарнякевіч, А.Пашкевіч, С.Токць, А.Пачобут і інш. Нумар багата ілюстраваны, што не можа не дадаць часопісу цікавасці.

Як адзначыў у прадмове гісторык Андрэй Вашкевіч, «маланкі вялікай міжнароднай палітыкі бліскаюць над намі, але ў Беларусі хіба толькі кожныя дзесяты зможа даць адказ на пытанне, што адбылося 17 верасня 1939 г. У 2009-м, у адрозненне ад 1999-га, не будзе на вуліцах каляровых плакатаў з чырвонаармейцам і селянінам. Тое, мабыць, добра. Але забывацца аб далёкім верасні нікому з нас, беларусаў, нельга».

Новы нумар часопіса выкліча хвалю водгукаў. Гэта несумненна.

Бо любое абмеркаванне Заходняй Беларусі і яе ролі ў фармаванні сучаснай беларускай нацыі выклікае шквал каментароў. Гэта як увасабленне падзелу на заходнікаў і ўсходнікаў. Тое, што нас некалі аб'яднала ў адной сацыялістычнай і прарасійскай Беларусі, сёння здольнае падзяліць у незалежнай.

**Алесь Пілецкі**

## Розніцы паміж людзьмі няма

На 101-м годзе з жыцця пайшоў адзін з самых уплывовых мысляроў свету, антраполаг Клод Леві-Строс.

Менавіта яго працы былі інтэлектуальным, навукова абгрунтаваным адказам расісцкім і каланіяльным ідэям першай паловы XX стагоддзя пра вяршэнства адных культур над другімі.

Ключавая ідэя Леві-Строса заключалася ў тым, што такія культурныя феномены, як адметнасці сацыяльнай арганізацыі, рытуалы, міфалогія, музыка або мова, разглядаліся як праявы ўніверсальных, уласцівых усяму без выняткаў чалавецтву, працэсаў мыслення.

Чалавечы розум — добра арганізаваны механізм, які здольны ўпарадкаваць любы досвед. Вось жа, Леві-Строс сцвярджае, што існуе адзіная, універсальная для ўсіх грамадстваў матрыца па арганізацыі культурных з'яваў, і таму дзяльба грамадстваў на «прымітыўныя» і «развітыя» — недарэчная. Стуль і вынікае для кого расчаравальная, для кого натхняльная ідэя роўнасці розных чалавечых супольнасцяў, у тым ліку нацыянальных і расавых меншыняў, побач з вялікімі цывілізацыямі.



Тое, што якоесьці афрыканскае племя не мае тэхналагічных набыткаў, зусім не сведчыць пра яго адсталасць, гэта адно кажа, што тое племя засяроджана на іншых прыярытэтах: прыродзе, адносінах са стыхіямі, жыцці роду і г.д., якія часам наватнаў і больш развітыя за адносіны і дасягненні заходняй цывілізацыі.

**Клод Леві-Строс**

нарадзіўся 28 лістапада 1908 у Брусэлі. Вывучаў філасофію і правы ў Сарбоне (1927—1932). Адначасова быў левым палітычным актывістам, сябрам Рабочага Інтэрнацыянала. У 1935 накіроўваецца ў Бразілію, дзе становіцца прафесарам універсітэта ў Сан-Паўлу, вывучаючы побыт індыянскіх плямёнаў кадзівэў і барора. Этнаграфічны збор, сабраны там, выклікаў фурор на выставе ў Парыжы. У 1940 па праграме Ракфелера па выратаванні еўрапейскіх навукоўцаў быў запрошаны ў Нью-Ёрк. Працаваў віцэ-дырэктарам Антрапалагічнага музея ў Парыжы, шмат гадоў быў прафесарам у Каледж дэ Франс. Асноўныя працы — «Раса і гісторыя» (1952), «Сумныя тропікі» (1955).

Леві-Строс — адзін са знішчальнікаў міфа заходняй цывілізацыі пра «адсталыя» плямёны. Ён бачыў у культурных феноменах (мастацтве, рытуалах) універсальную мову, спрабуючы выявіць яе граматыку, або «глыбінную структуру».

**Лявон К**

## СЫСтэма

Выйшаў паэтычны трыб'ют Анатолю Сысу, зборнік вершаў, прысвечаны творцу, чыёй асобна ўзятай пухкай душы было зацесна ў гэтым няўтульна-прыземленым свецe-камуналцы.

У культурных каардынатах Сыс — знакавая постаць пакалення «Тутэйшых». Ён — ікона, і таму як вынік ягоныя жыццё і смерць — крыніца натхнення, мала не абавязковая тэма паэтычных практыкаванняў для цэлага шэрагу айчынных паэтаў. Вось жа, Анатолю Сысу даюць павагу: Рыгор Барадулін, Адам Глобус, Алег Мінкін, Леанід Галубовіч і Міра Лукша.

**ЛК**





**Ягамосць:** вершы-прысвячэнні Анатолю Сысу (бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»). Уклад. Сяржук Сыс. — Мінск: Медысонт, 2009. — 80 ст., 200 ас.

## Шалкевіч распісаўся

Сваю першую кнігу бард прэзентаваў 5 лістапада, другую — рыхтуе да выдання.

У кнізе «Блюз Вясна» Віктар Шалкевіч сабраў свае вядомыя вершы і песні. Другая кніга «Рэквіем па непатрэбных рэчах» — эсэ і ўспаміны пра дарагія аўтару тэлевізар «Рэкорд- 7», матацыкл «ВОСХОД- 2М» і радыёлу «УРАЛ». Аўтар піша, што «... з іх пажыткy аніякага ўжо не будзе, але развітвацца з імі шкада, таму што яны занадта многа значаць». У кнізе сабрана амаль 30 такіх «духоўных» рарытэтаў.

Віктар Шалкевіч прадставіў свой кніжны дэбют «Блюз Вясна» на вечарыне, прымеркаванай да Дзён Св. Губерта ў Гродне.

**ХМ**

# Прыстаўлены да Коласа

**Споўнілася сто гадоў з дня нараджэння Максіма Лужаніна — аднаго з самых знакамітых савецкіх агентаў у шэрагах беларускай інтэлігенцыі.**

Якуба Коласа пакаленні беларускіх школьнікаў бачылі яго, Максіма Лужаніна, вачыма, праз хрэстаматыйную ўжо кнігу «Колас расказвае пра сябе».

«Маладняковец», пасля «ўзвышэнец» Максім Лужанін удзельнічаў ва ўсіх бурапенных працэсах літаратурнага жыцця 1920-х. Творчыя сустрэчы, дыспуты, вусная газета «Чырвоны прамень», якую рыхтаваў з Пятром Глебкам і Паўлюком Трусам. Подпіс Лужаніна, побач з аўтографамі Маракова і Дарожнага, ёсць пад лістом у абарону Сяргея Ясеніна — пасля вульгарызатарскага артыкула пра паэта ў «Комсомольской правде».



З Якубам Коласам і Максімам Танкам на Нарачы.

Як і большасць калегаў па цэху, Лужанін у 1933 г. быў арыштаваны як *«член контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі»*. Для многіх паэтаў арышт у 1930-я з прысудам «нацдэм» стаў апошнім пунктам біяграфіі. Максім Лужанін жа атрымлівае два гады высылкі ў Кемераўскую вобласць, але праз некалькі месяцаў вяртаецца адтуль, а пасля працуе... у Маскве: рэдактарам-арганізатарам Галоўнай рэдакцыі літаратуры па машынабудаванні. У тыя часы гэта быў верны знак, што чалавек пайшоў на блізкую супрацу з НКВД.

Такім жа чынам у 1930-я, пад страхам смерці, былі завербаваныя многія — нават такія антысавецкі як Францішак Кушаль, Наталля Арсеннева і Антон Адамовіч.

З пачаткам вайны Лужаніна адпраўляюць на фронт. Менавіта ягоны таварыш па няшчасці Антон Адамовіч успамінаў, што Максім Лужанін быў пасланы пасля вайны агітаваць беларусаў, што апынуліся на Захадзе, у лагерах для перамешчаных асобаў, вяртацца ў СССР. І што менавіта Лужанін шапнуў яму і іншым ціхенька, каб не вярталіся ні ў якім разе... Нешта заставалася, значыць, людскае ў Лужаніну і на такой службе.

Пасля вайны Лужаніна паставілі асабістым сакратаром Якуба Коласа. Рыхтаваў яго публікацыі, дапамагаў разбіраць пошту і архівы. Даніла Міцкевіч згадваў, што сам Народны пісьменнік Беларусі быў дастаткова панікілівы. Супастаўляючы факты з біяграфіі Лужаніна, падазраваў: сакратар прыстаўлены спецслужбамі. Часам, перачытваючы падрыхтаваныя Лужаніным да публікацыі матэрыялы, Колас не-не ды і выкрэсліваў нападкі на тых ці іншых асобаў, якія з'яўляліся з ініцыятывы сакратара. Класік добра ведаў, чым можа адазвацца для згаданых яго слова.



Максім Лужанін (справа) з паэтам Сяргеем Дарожным. Дарожны скончыць жыццё ў сталінскіх лагерах. Лужанін уратуецца, працуючы на сталінскую ахранку.

Жыццё Лужаніна было дэтэктывам, многія сюжэтныя хады якога адкрыюцца разам з архівамі КДБ.

Дэтэктыў той скончыўся зусім нядаўна. Максім Лужанін паставіў, пэўна, рэкорд сярод аднагодкаў: дажыў да беларускай незалежнасці і нават сустрэў XXI стагоддзе. Яго не стала 13 кастрычніка 2001 года.

Ягоная жонка Яўгенія Пфляўмбаум была выдатнай паэткай. Праўда, прызнанне яна атрымала толькі пасля смерці. Пры жыцці заставалася ў цені мужа, падпісвала ягоным імем свае пераклады, каб лягчэй трапіць у друк. Дзяцей гэтая пара не мела.

**Сяргей Мікулевіч**

**Максім Лужанін**

Сапр. Аляксандр Каратай. Нарадзіўся 2 лістапада 1909 у вёсцы Прусы (цяпер Салігорскі раён Мінскай вобласці). Публікаваўся з 1925. Першая кніга вершаў выйшла ў 1928 і называлася «Крокі». Сябра літаб'яднання «Маладняк». З 1931 працаваў ва «Узвышшы» і на Беларускім радыё. Арыштаваны ў 1933. З 1935 — працуе ў Маскве. У 1935—1941 рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратуры па машынабудаванні ў Маскве. Пасля вайны сакратар Якуба Коласа. З 1959 член сцэнарнай калегіі, у 1967—1972 галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм». Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1969), заслужаны дзеяч культуры Польскай Народнай Рэспублікі (1975), лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа 1965 г. за аповесць-эсэ «Колас расказвае пра сябе» (1964). Перакладаў на беларускую асобныя творы Грыбаедава, Гогаля, Радзішчава, Пушкіна, Маякоўскага, Міцкевіча, Сыракомлі. Памёр 13 кастрыніка 2001 у Мінску.

**АП**

**Вечар памяці Максіма Лужаніна**

12 лістапада а 17-й у Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 15) — вечар памяці «Моваю сэрца…», прымеркаваны да 100-годдзя Максіма Лужаніна.

# Яны расхісталі Мур

20 гадоў таму, 9 лістапада 1989 г., абрынуўся Берлінскі мур. Гэта добрая нагода адсвяткаваць разам з немцамі, паўспамінаўшы, які ўнёсак яны зрабілі ў сучасную поп-музыку. Прыгадаем, можа, паспяваем: «Боні М», «Скорпіёнс», «Альфавіль», «Рамштайн»...

### Вецер перамен

Калі ўжо што казаць пра Берлінскі мур і нямецкую музыку, дык найперш варта згадаць пра ўлюбёнцаў рамантычна настроеных школьніц, выканаўцаў прачулых баладаў, гурт «Скорпіёнс», або папростаму, «Скарпоў», як іх тут любоўна называлі.

Іх песня «Вецер пераменаў» была менавіта тым, чаго чакалі ад року: яскравая перадача духу часу і рытму пакалення, на вачах якога крышыўся СССР.

За год да падзення муру, у 1988-м, «Скорпіёнс» зладзілі канцэрт у пячонках тагачаснай імперыі зла — Ленінградзе (вядома, з дазволу імперска-злоснага кіраўніцтва). А ў 1989-м у Маскве гановерцаў нават прыняў генсек Міхаіл Гарбачоў.

І што з таго, што саліст «Скорпіёнс» Клаус Майнэ напісаў Wind of Change, дзе распавядаецца пра паездку ў Маскву, на год раней за саму паездку. Хацелася бадзяцца ночы



навылёт па вуліцах, марыць і ўдыхаць гэтую такую пераменлівую плынь паветра. Гэта быў гімн эпохі, які спалучаўся з мастацкім свістам Клауса Майнэ.

І няхай цяпер «скарпіёны» нічога новага не пішуць. Дзядзькі па-майстэрску стрыгуць купоны, ездзячы па канцэртах і выконваючы старыя добрыя баевікі. Але мы ўсё роўна ўдзячныя ім за тое «чароўнае імгненне ў тую дзівосную ноч, калі дзеці заўтра нарэшце змаглі марыць пра вецер перамен».

### Бо не ем

Несамавіты з выгляду танцор гурту Boney M, Бобі Фарэл, спрычыніўся да папулярнага беларускага анекдота канца 1970-х:

— Ты чаго такі худы?

— Бо не ем.

Але кпіны — толькі ад замілавання дыскатэчна-бесшабашным ансамблем. Рэдкае вяселле тады абыходзілася без просьбаў ад сяброў маладога да рэстаранных музыкаў «злабаць «Распуціна». Сапраўды, канец 1970-х — зорны час гэтых дэміургаў папсы. У боніэмцаў на ўзбраенні было крыху дыска-музыкі, трохі госпелу, і шмат знешняга выгляду: чаго варты вечна аголены торс Бобі і дзікія нёўтаймаваныя скокі падпявалаў?

За 5 гадоў — 7 хітоў, што трапілі на самы верх поп-градацыі. Сярод іх, ну, зусім ужо мега-дупер-пупер-шлягеры «На рэках Вавілонскіх» ды «Распуцін».

### Заўжды маладыя

«Альфавіль»: яны выглядалі добра, яны спявалі добра, на паліцах дыскарняў яны пачуваліся добра: паміж Майклам Джэксанам і Бой Джорджам. Асабліва альбом Forever Young — вечна малады альбом-васьмідзясятнік: лёгкадумны, якасны, запамінальны, поўны пошуму сінтэзатараў і футурыстычных водараў.

Цяпер, слухаючы альфавільскія песні, кшталту A Victory of Love, разумееш, наколькі яны ўваднач вечныя, ідыёцкія і выдатныя. Як правільна слухаць «Альфавіль»: замкнуўшыся ў кватэры нядзельным вечарам, уключыўшы радыёперадачу, прысвечаную 1980-м.

### Падымі мяне па-над сцяною

Амерыканцы, не вельмі талерантныя да песняў не па-амерыканску, усё ж пачалі ў 1984-м слухаць нямецкамоўны хіт Luftballons99 спявачкі Нены, які трапіў на другое месца ў штатаўскіх хіт-парадах. Усё дзякуючы папулярнай тэматыцы халоднай вайны. Песня апавядала пра трэцюю сусветную, якая ўсчалася праз паветраныя шарыкі, якія заляцелі не туды. Песня была прыдуманая на канцэрце «Ролінг Стоўнз» у Заходнім Берліне, калі ў паветра выпусцілі сотні балонікаў: аўтар толькі дамысліў, што здарыцца, калі тыя балонікі пералятуць за Мур.

### Гер Рамштайн і кампанія

«Скорпіёнс» першым уварваўся ў коліс цалкам англа-амерыканскі свет металічнай музыкі. Потым гэты мур парушылі хэві-металісты «Акцэпт» і іх пранізлівагалосы саліст Уда Даркшнайдэр, пасля — трэш-металісты «Крыэтар» і, вядома, выкштальцоны «Рамштайн», які працягвае выкарыстоўваць у асабістых мэтах стэрэатыпы пра немцаў і Нямеччыну. Знайшліся шанавальнікі «Рамштайна» і сярод беларускіх музыкаў: паслухайце як «Нейрадзюбель» спявае I Feel You на трыб'юце Personal Depeshe — ну, усё роўна як «Рамштайн» выконвае песню «Дэпэш Моду».

Увогуле ж, у Нямеччыне больш за 30 метал-канцэртаў штогод, сярод якіх ужо 20 гадоў зоркай непагаснай зіхціць вялізны фестываль «Вакен», які збірае дзясяткі тысячаў слухачоў. Ды што фестываль: варта завітаць на звычайную бензакалонку паміж Бонам і Берлінам і ўбачыць з дзясятак часопісаў, прысвечаных цяжкаму року, каб зразумець, наколькі жалеззе глыбока пусціла карані ў нямецкай глебе.

**Павал Касцюкевіч**

# Містэр прэзідэнт Еўропы, хто Вы?

Піша **Вікторыя Грынеўская**.



Блэр і Сарказі: падтрымка ці суперніцтва?

3 лістапада прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаўс, апошні з кіраўнікоў дзяржаваў Еўрасаюза, паставіў подпіс пад эпахальнай Лісабонскай дамовай. За два гады ратыфікацыі дамова двойчы прайшла выпрабаванне ірландскім рэферэндумам, а таксама чэшскім Канстытуцыйным судом і ў выніку перамагла ўсе еўраскептычныя страхі.

Лісабонская дамова, якая ўступіць у сілу ў снежні 2009 г., — новы этап у развіцці Еўрасаюза. Прынятая замест праваленай у Францыі і Нідэрландах еўраканстытуцыі, яна пакліканая рэфармаваць галоўныя органы Еўрасаюза: Еўрапарламент, Еўракамісію і Раду ЕС. Адной з такіх рэформ з'яўляецца ўвядзенне пасады пастаяннага прэзідэнта Рады ЕС, якога прэса паспела ахрысціць «Прэзідэнтам Еўропы».

Рада ЕС на дадзены момант — гэта тэрмін, які ўжываецца для апісання сустрэч кіраўнікоў дзяржаваў-чальцоў Еўрасаюза некалькі разоў на год у Брусэлі. Існуе ратацыя, паводле якой краіны старшынююць у Радзе ЕС, — кожная па 6 месяцаў. Другое паўгоддзе 2009 г. у Радзе ЕС старшынюе Швецыя, таму прэзідэнтам Рады на гэты час з'яўляецца прэм'ер-міністр Швецыі. Паводле Лісабонскай дамовы, такі парадак скасоўваецца: прэзідэнт Рады ЕС будзе выбірацца на 2,5 года.

## Суперстар ці цырымоніймайстар?

Увядзенне гэтай пасады выклікае спрэчкі сярод еўрапейскіх уладных колаў. Працэдура выбара прэзідэнта Еўропы і яго службовыя абавязкі застаюцца туманнымі. Згодна з Лісабонскай дамовай, пасада прэзідэнта збольшага адміністратыўная, асноўныя абавязкі — каардынацыя працы Рады ЕС і арганізацыя міжнародных сустрэч. Акрамя таго, прэзідэнт Рады будзе прадстаўляць Еўрапейскі Саюз на сусветнай арэне і гаварыць ад імя аб'яднанай Еўропы. Прэзідэнт Еўропы будзе атрымліваць 270 000 еўра ў год, мець спецыяльную машыну з шафёрам, у яго офісе будуць працаваць 20 памочнікаў. Прыватны самалёт і афіцыйная рэзідэнцыя, тым не менш, былі адкінутыя Еўрапарламентам як непатрэбная помпа...

Існуе меркаванне, што ў прэзідэнта будзе не ставаць кадраў і рэсурсаў для эфектыўнага выканання сваіх абавязкаў і ён ператворыцца ў «гульнявы мяч» паміж еўрапейскімі лідэрамі. На карысць гэтага сведчыць яшчэ і тое, што прэзідэнт Еўропы непадкантрольны Еўрапарламенту.

Ёсць таксама небяспека канкурэнцыі між прэзідэнтам Рады ЕС і старшынём Еўракамісіі (зараз гэты пост займае Жазэ Мануэль Барозу), а таксама паміж іх адміністратыўнымі апаратамі. Супярэчнасць у тым, што старшыня Еўракамісіі мае ўладу і ўплыў, але не мае значнай вядомасці і прэстыжу. Адваротная сітуацыя з прэзідэнтам Рады ЕС: пасада вельмі прэстыжная, але не вельмі ўплывовая.

Такім чынам, будучыня прэзідэнта Еўропы залежыць выключна ад асобы, якая першай апынецца на гэтай пасадзе. «Суперстар»? Чакайце харызматыкаў, якія будуць актыўна выступаць ад імя ўсяго Еўрасаюза, шмат ездзіць па свеце, прамаўляць прыгожыя спічы і прымяраць у люстэрку вянок рымскіх цэзараў. «Цырымоніймайстар»? Усе страхі наконт канкурэнцыі за ўладу з Еўракамісіяй могуць быць забытыя, бо кіраваць будзе сталы заслужаны лідэр без цэзарыянскіх амбіцый, быццам адпраўлены на ганаровую пенсію.

Галоўнымі кандыдатамі на пасаду прэзідэнта Еўропы з'яўляюцца экс-прэм'ер Вялікабрытаніі Тоні Блэр і цяперашні прэм'ер-міністр Люксембурга Жан-Клод Юнкер. Поўныя процілегласці і найяскравейшыя прадстаўнікі роляў «суперстара» і «цырымоній майстра».

## Тоні Блэр

Аб Тоні Блэру ў якасці прэзідэнта Еўропы гаварылі яшчэ ў 2002 г., нават да спробы падпісання еўраканстытуцыі. Чуткі пра кандыдатуру Блэра як найбольш імаверную ўзмацніліся пасля яго адстаўкі з паста прэм'ер-міністра ў 2007 г. У пачатку 2008 г. Нікаля Сарказі запрасіў Блэра на сход сваёй партыі, дзе выказаў брытанцу падтрымку словамі: «Ён нам патрэбны ў Еўропе». Паводле апытання ліпеня 2008 г., Блэр быў найжаданейшым кандыдатам для еўрапейскага бізнэсу. Нават сам Тоні, які пасля сыходу з брытанскай палітыкі сядзеў на мільённых зарплатах у банку JP Morgan і цюрыхскай фінансавай кампаніі, пачаў быў цяплець да новай пасады з заробкам «усяго» 270 000 еўра ў год.

Аднак яму не стае еўрапейскай падтрымкі. Катэгарычна супраць Блэра настроеная Ангела Меркель, а таксама большасць кіраўнікоў малых дзяржаваў ЕС. У Еўрапарламенце Блэра не хочуць бачыць на гэтай пасадзе дзве асноўныя фракцыі — сацыялісты і хрысціянскія дэмакраты. Яны нават стварылі міжпартыйную ініцыятыўную групу за недапушчэнне Тоні ў еўраструктуры. «Адзінае, аб чым думаў Блэр, калі быў прэм'ер-міністрам — гэта адносіны з лонданскім Сіці, і такая ментальнасць прывяла да сусветнага фінансавага крызісу», — так ахарактарызаваў Блэра хрысціянскі дэмакрат з Еўрапарламента Міхаэль Галер.

Як паведамляе The Guardian, Сарказі на апошняй сустрэчы з Меркель таксама згадзіўся, што кандыдат павінен быць правым ці цэнтрыстам (а Блэр — лейбарыст, што не падпадае пад гэтае вызначэнне), і такім чынам нанёс Блэру ўдар у спіну. Супраць Блэра кажа і яго супярэчлівае, асабліва з еўрапейскага пункту гледжання, мінулае: сяброўства з Джорджам Бушам і ўдзел у вайне ў Іраку. Акрамя таго, Блэр прадстаўляе найбольш еўраскептычную краіну Еўрасаюза, якая не плануе ўступаць ў Шэнген і адмаўляецца ад фунта сцерлінга, што не дадае яму папулярнасці ў кантынентальнай Еўропе.

У гэтым ёсць і віна самога Блэра. Паводле The Daily Telegraph, падыход Блэра да атрымання пасады прэзідэнта Еўропы быў выражаны словамі: «Яны павінны самі да мяне прыйсці». Ён не збіраўся пэцкаць рукі ў закулісная барацьбе. «Усё як заўжды, — іранічна піша The Daily Telegraph. — Тоні Блэр паўтарае лёс большасці брытанскіх удзельнікаў «Еўрабачання». Спявак, выбраны прадстаўляць Злучанае Каралеўства, заяўляе, што яго песня будзе найлепшым брытанскім нумарам. Затым надыходзіць лёсавызначальная ноч у Брусэлі, калі пачынаюць аб'яўляць балы, і становіцца зразумелым, што Францыя і Германія змовіліся з малымі краінамі, каб пракінуць Вялікабрытанію. У выніку балы фаварыт становіцца апошнім, а перамагае Чарнагорыя з шараговай тупой песняй».

Але пакуль балы Тоні Блэру ў Брусэлі не выставілі, а ён, як ні круці, адзін з самых вядомых і харызматычных лідэраў у Еўропе — «суперстар».




Ангела Меркель абедзьвюма рукамі за кандыдатуру Жана Клода Юнкера.

## Жан-Клод Юнкер

Жан-Клод Юнкер, цяперашні прэм'ер-міністр Люксембурга, увасабляе ўсе тыя якасці, якіх не стае Тоні Блэру ў барацьбе за пост прэзідэнта Еўропы. Юнкер — еўрапеец «з вялікай літары», палымяны прыхільнік еўрапейскай інтэграцыі, суаўтар фундаментальнай Маастрыхтскай дамовы, пастаянны прэзідэнт Еўрагрупы — аб'яднання міністраў фінансаў краін еўразоны. Як прадстаўнік маленькага герцагства Люксембург, ён можа з'яўляцца гарантыяй для малых дзяржаваў Еўрасаюза.

Больш за тое, сам Юнкер быў у апазіцыі да стварэння пасады моцнага прэзідэнта Еўропы — якой яе калісьці задумвала групоўка Аснар-Блэр-Шырак. Юнкер лічыў, што моцны прэзідэнт Рады ЕС, незалежны ад Еўрапарламента, з лёгкасцю ўзурпуе паўнамоцтвы залежнага ад Еўрапарламента прэзідэнта Еўрапейскай камісіі. Акрамя таго, маленькія краіны Еўрасаюза бачылі прэзідэнта Еўропы марыянеткай вялікіх краін. Перад правальнымі рэферэндумамі па еўраканстытуцыі ў 2005 г. Юнкера інтэнсіўна лабіравалі на гэтую пасаду, але ён адмовіўся, бо быў выбраны люксембуржцамі на пасаду прэм'ер-міністра.

Незадоўга да падпісання Лісабонскай дамовы, у кастрычніку 2007 г., Сарказі зноў агучыў на публіцы імя Юнкера. Кандыдатуру прэм'ер-міністра Люксембурга падтрымліваюць многія лідэры малых дзяржаваў, а таксама фракцыі хрысціянскіх дэмакратаў і сацыялістаў у Еўрапарламенце. Ангела Меркель абедзвюма рукамі за тое, каб ён заняў гэтую пасаду. Некаторыя аналітыкі лічаць яго і сапраўдным выбарам Сарказі, які проста своечасова зрабіў хітры рэверанс перад Блэрам.

Юнкера могуць не падтрымаць еўраскептычныя краіны кшталту Вялікабрытаніі, а таксама ўсе тыя, хто бачыць прэзідэнта Еўропы моцным і харызматычным. А Юнкер не такі. Ён не будзе дзерці нос ад гучнага тытула. І ні на крок не адступіцца ад Лісабонскай дамовы, дзе роля прэзідэнта Еўропы прапісаная як цырыманіяльна-адміністратыўная.

## Цёмныя конікі

Блэр і Юнкер — не адзіныя кандыдаты ў спісе, а толькі самыя «даўно называныя». З ратыфікацыяй Лісабонскай дамовы распачынаецца перыяд інтэнсіўнага лабіравання і спекуляцый адносна будучага прэзідэнта Еўропы. Сярод іншых прэтэндэнтаў гучыць імя прэм'ер-міністра Бельгіі Хермана ван Рампю. Называюцца таксама былы прэзідэнт Фінляндыі і Нобелеўскі лаўрэат Марці Ахцісаары, былы канцлер Аўстрыі Вольфганг Шусель, прэм'ер-міністр Нідэрландаў Ян Петэр Балькенэндэ, былы прэм'ер-міністр Швецыі Карл Більт. Паводле The Daily Telegraph, кандыдатаў аб'явяць на саміце ў Брусэлі не пазней за 19 лістапада. Еўрапейскія лідэры ўсё яшчэ мараць знайсці «рэдкую птушку», якая б сумяшчала харызму Блэра і еўраінтэграцыйныя заслугі Юнкера.




## КАНЦЭРТЫ

**«Тройца» ў КЗ «Мінск»**

**15 лістапада ў КЗ «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5)** — юбілейны канцэрт этна-трыа «Тройца» «Аўтабаны і менестрэлі». **Пачатак а 19-й.**

**Крама**

**22 лістапада а 19-й у «Графіці»** — канцэрт «Крамы».

**Героі гітары**

**23 лістапада а 19-й у «Графіці»** — «Guitar Hero». Бяруць удзел: **С. Трухановіч** («Крама», «Палац»), **В. Абрамовіч** (Neuro Dubel), **А. Хамутоў.**

**Sciana ў Гродне**

**12 лістапада** — дзве з паловай гадзіны рок-н-рола ад гуртоў **Sciana** (Брэст) і **UNIA** (Мінск) **у Гродне**! **Адрас: бульвар Ленінскага Камсамола, 21, ліцэй №1. Пачатак а 19-й.**

**«Без білета»**

**12 лістапада ў «Рэактары» (вул. Харужай, 29)** гурт «Без Білета» прэзентуе новы альбом «Афрыка». **Пачатак а 19-й. 13 лістапада** тамсама гурт святкуе 10-годдзе. Настальгічная праграма. **Пачатак а 19-й.**

**Madera Hard Blues & White Night Blues**

**12 лістапада ў «Графіці»** — Madera Hard Blues & White Night Blues. **Пачатак а 19-й.**

**P.L.A.N.**

**14 лістапада а 17-й у Палацы вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21)** зайграе гурт Андрэя Плясанава P.L.A.N.

**Сяргей Пукст у «Графіці»**

**20 лістапада а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт Сяргея Пукста.

**Лютніст Антоні Пільх**

Польскі Інстытут у Мінску і Музычнае таварыства «Ліра» запрашаюць на канцэрт вядомага польскага лютніста Антонія Пільха. Канцэрт адбудзецца **13 лістапада (пятніца) ў касцёле Св. Сымона і Алены (пл.Незалежнасці). Пачатак а 19-й.** Уваход вольны.

**Найлепшыя блюзы Вілі Дыксана**

**13 лістапада ў Палацы Рэспублікі (Кастрычніцкая пл., 1)** — «Willie Dixon's best blues». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Мінск Блюз 2009**

**14 лістапада а 17-й у канцэртнай зале «Мінск» (вул. Кастрычніцкая, 5)** — IV міжнародны фестываль «Мінск Блюз-2009». Бяруць удзел музычныя калектывы пяці краін і адзін з найлепшых слайд-гітарыстаў свету — **Соні Ландрэт**. Апроч яго, на фестывалі выступяць каманды **Hendrix Cousins** (Швейцарыя), **Twins Peek** (Латвія), **Blackmailers Blues Band**, **Vladimir Rusinov & the Jumping Cats** (Расія) і беларускія выканаўцы **Аляксандр Цыганок**, **Леанід Вярэніч**, **Ірына Цішчанка**, **Сяргей Курак**, **the Road Dogs**.

**Часопіс «Паміж»**

**12 лістапада а 19-й у Музеі Багдановіча (вул.Багдановіча, 7а)** адбудзецца прэзентацыя 8-га нумара часопіса «Паміж», прысвечанага тэме дзяцінства. У прэзентацыі прымуць удзел Алесь Анціпенка, Валянцін Акудовіч, Андрэй Хадановіч, Віталь Рыжкоў, Марыйка Мартысевіч, Віктар і Вера Жыбулі.




**Сустрэча з Алегам Хаменкам**

**12 лістапада ў краме «Чайны ліст» (вул.Рэвалюцыйная, 12)** —сустрэча з Алегам Хаменкам. **Пачатак у 18.30.**

**«Партызаны» зноў у Смаргоні**

Прэзентацыя нашумелага арт-праекта «Канец словаў» альманаха сучаснай беларускай культуры pARTisan пройдзе **14 лістапада а 13-й у Смаргонскім гісторыка-краязнаўчым музеі**.

**Фестываль электроннай музыкі**

**14 лістапада ў выставачным комплексе «Белэкспа» (пр.Пераможцаў, 14)** пройдзе міжнародны фестываль электроннай музыкі Godskitchen Urban Wave. **Пачатак а 22-й.** Упершыню ў Беларусі выступяць галандскі ды-джэй **Сандэр Ван Дорн** і брытанскі ды-джэй **Марк Ітсан.**

**Пісьменнікі ў Любанскім раёне**

**12 лістапада** паэты Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк і празаік Барыс Пятровіч сустрэнуцца з чытачамі ў вясковых школах Любанскага раёна. **СШ вёскі Загалле прыме паэтаў а 10-й, СШ вёскі Сосны — у 11.15, Палічынская вясковая школа — у 12.30, а ў 13.30 — СШ вёскі Малыя Гарадзяцічы.**

## ВЫСТАВЫ

**Камізэлька Сяргея Прытыцкага**

**У Нацыянальным гістарычным музеі (вул.Маркса,12)** праходзіць выстава, прысвечаная 70-годдзю аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. На ёй сабраны настолькі цікавыя экспанаты, што дзіву даешся, як яны захаваліся! Напрыклад, камізэлька Сяргея Прытыцкага з дзіркай ад кулі, якой яго паранілі паліцыянты, пасля таго як падчас суду ў Вільні ён страляў у правакатара, які выдаў шмат таварышаў Сяргея. Мундзіры польскіх, савецкіх, нямецкіх жаўнераў таго часу. Сучасныя берасцяныя граматы — транспаранты, выкананыя ў Беларусі прыхільнікамі камуністаў з падручных матэрыялаў і падручным правапісам і лексікай. Вельмі цікава! Нацыянальны гістарычны на вышыні!

**Millenium**

**У Палацы мастацтва да 15 лістапада** працуе выстава «Millenium», прысвечаная 1000-годдзю першай згадкі ў пісьмовых крыніцах наймення Літва. Поруч з творамі беларускіх мастакоў розных пакаленняў асобны раздзел экспазіцыі складаюць творы дзяцей.

**Польскі пейзаж**

**У Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47)** працуе выстава «Польскі пейзаж». Яна складаецца з твораў, якія паўсталі падчас грамадска-палітычных зменаў, у перыяд, які для польскага мастацтва аказаўся надзвычай плённым. Выставу адкрывае рэалістычная карціна Лявона Тарасэвіча.

**Падарожжа па мінулым стагоддзі**

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 22 лістапада** працягваецца выстава Уладзіміра Тоўсціка «Падарожжа па мінулым стагоддзі». Стылёвы жывапіс, незвычайная манера пісьма, тонкія лініі, чыстыя фарбы. Радасна ўсведамляць, што гэты мастак жыве ў Мінску побач з табой. Абавязкова варта наведаць.

## ТЭАТР

**12 лістапада**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»

**13 лістапада**

**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Загадкавыя варыяцыі»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»

**14 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Падарожжа ў Княства Сноў»
**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Музычны тэатр** — «Шахеразада». «Іспанскія мініяцюры».
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

**15 лістапада**

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвей»
**Музычны тэатр** — «Кажан»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**16 лістапада**

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**17 лістапада**

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»
**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»

**18 лістапада**

**Тэатр оперы і балета** — «Жарсці (Рагнеда)»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Гендэльбах»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Кабала святош (Мальер)»

**19 лістапада**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне Галадара»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Музычны тэатр** — «Расійскі фантом»

**20 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Музычны тэатр** — «Ноч у Венецыі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр оперы і балета** — «Дон Кіхот»

## КІНО

# Анімэ пра Марата Казея

**Першы атрад** (Fasuto sukuwaddo)

Японія — Расія — Канада, 2009, каляровы, 55 хв

**Рэжысёр:** Ёсіхару Асіна

**Жанр:** Містыка-вайсковае анімэ

**Адзнака:** 6,5 (з 10)




1942 год. Каб перамагчы ў вайне, чарнакніжнікі з «Ананербе» выклікаюць на помач дух барона фон Вольфа з арміяй лютых прывідаў. З імі змагаецца піянерка Надзя пад кіраўніцтвам генерала Бялова. Яна выпраўляецца на той свет, каб знайсці сяброў, замардаваных нацыстамі. Аднаўлены Першы атрад у чырвоных гальштуках ірвецца ў бой...

Расійска-японскі містыка-вайсковы мультфільм — цікавы міжкультурны гібрыд.

Па-першае, гэта анімэ, намаляванае японцамі, — і паводле японскіх канонаў. Менавіта ў анімэ дзейнічаюць школьніцы-забойцы, сакрэтныя акультныя атрады змагаюцца з прывідамі.

З іншага боку, падзабытыя сёння піянеры-героі — савецкія дзеткі-камікадзэ.

Анімацыя спалучае савецкія агітплакаты і японскі дэманізм.

**Андрэй Расінскі**

# Вазоны ад хваробаў

Калі нам баліць галава, мы ў апошнюю чаргу лічым прычынай гэтага паветра вакол нас. Між тым, забруджаныя вада, паветра і глеба штогод становяцца прычынай 40% смерцяў па ўсім свеце, забіваючы каля 2 мільёнаў людзей. Паводле дадзеных ЕС, больш за 300 тысяч смерцяў прыпадае на краіны Еўропы. У адным толькі Таліне з-за хваробаў, выкліканых забруджаным гарадскім паветрам, заўчасна паміраюць 296 чалавек штогод.

Прычым паветра ў памяшканнях можа быць аж у 12 разоў больш забруджанае, чым на вуліцы. Бо ў памяшканнях дадаюцца хімікаты і таксіны, лакі, клеі, мэбля, адзенне, растваральнікі, будаўнічыя матэрыялы і нават водаправодная вада. Забруджанае паветра ў памяшканнях становіцца прычынаю больш за 1,6 млн смерцяў штогод.



**А Hoya carnosa яшчэ і надзвычай прыгожа цвіце.**

Пакаёвыя расліны могуць ратаваць чалавечыя жыцці, піша Daily Telegraph. Даследаванне, праведзенае супрацоўнікамі ўніверсітэта Джорджыі, ЗША, паказала, што дэкаратыўныя расліны радыкальна скарачаюць узровень стрэсу ў чалавека і падвышаюць прадукцыйнасць працы, паглынаючы шкодны бруд з паветра.

Навукоўцы рэкамендуюць на кожным працоўным месцы паставіць па пяць відаў раслінаў, якія будуць ачышчаць паветра ў памяшканні. У іх лік увайшлі плюшч звычайны (Hedera helix), расліны з васковым лісцем (Hoya carnosa) і папараці (Asparagus densiflorus). Гэтыя расліны паглынаюць большую частку таксінаў з паветра.

**СХ**

# Родная мова да нараджэння

Немаўляткі плачуць інтанацыямі роднае мовы.



Пра гэта піша Science News. Даследаванні пад кіраўніцтвам антраполага Кэтлін Вермке праводзілася ў Вюрцбургскім універсітэце, Германія.

У эксперыменце бралі ўдзел 60 здаровых нованароджаных, 30 з франкамоўных, 30 з нямецкамоўных сем'яў. Даследчыкі запісалі 2,5 тысячы розных «плачаў»: калі дзецям мяняюць падгузнікі, калі яны галодныя і г.д. У палове выпадкаў ім удалося дакладна ўсталяваць сувязь паміж асаблівасцямі плачу і інтанацыямі роднай мовы. Дзеці з нямецкіх сем'яў пачыналі плакаць на высокіх танах і заканчвалі больш нізкімі, дзеці з французскіх сем'яў, наадварот, падвышалі тон па меры нарастання плачу.

Навукоўцы звяртаюць увагу на тое, што знаёмства з гукамі роднай мовы дзіця пачынае ўжо на апошніх месяцах цяжарнасці, паколькі яно чуе, што адбываецца па-за ўлоннем. Даўно вядома, што дзеці ад нараджэння адрозніваюць голас маці ад галасоў іншых людзей, а таксама родную мову — ад іншых моў. Немаўляты таксама спрабуюць капіяваць родную мову ад самага нараджэння.

Здольнасць дзіцяці ўспрымаць гукі развіваецца ўжо на 19 тыдні. Гэта актыўна выкарыстоўваюць прыхільнікі прэнатальнага выхавання. Яны лічаць, што «музычнае выхаванне» немаўляці да родаў хоць і не фарміруе музычны густ, аднак аказвае пазітыўны ўплыў на пазнейшае сэнсаматорнае, моўнае, эмацыйнае, сацыяльнае і фізічнае развіццё малога.

**СХ**

## Карэянка здала пісьмовы іспыт на правы кіроўцы з 950-й спробы

Шасцідзесяціводвухгадовая Чха Са Сун рабіла ледзь не штодзённыя спробы адолець экзамен, пачынаючы з 2005 года. Каб здаць іспыт, трэба было атрымаць 60 балаў са 100 магчымых. Урэшце, з 950-й спробы карэянка здзейсніла, здаецца, неверагоднае — атрымала запаветныя 60 балаў.

Цяпер аўтаматарку чакае яшчэ больш складаны экзамен — практычнае кіраванне.

Чха Са Сун займаецца продажам прадуктаў і тавараў побыту. Яна возіць з сабой ручную тачку з таварам, але, каб пашырыць свой бізнэс, хоча ездзіць на машыне.

Па падліках паліцыі, карэянка патраціла на пісьмовыя тэсты прыкладна 4,2 тысячы даляраў.

**ЯМ, паводле RBC**

БЕЛАРУСЬ—ЕС

# Навошта беларусам электронныя пашпарты

У бліжэйшай будучыні Беларусь пяройдзе на біяметрычныя пашпарты. Чакаецца, што першыя дакументы з электроннымі чыпамі будуць выдадзены грамадзянам ужо ў 2011 годзе.

Электронныя пашпарты і візы з біяметрычнымі дадзенымі ў Еўропе выдаюць практычна паўсюдна, і яны там ужо сталі будзённасцю. Нам ніхто не збіраецца навязваць біяметрычны пашпарт як даннасць, але калі краіны—суседзі прымуць новыя міжнародныя патрабаванні ў гэтай галіне, то нашым суграмадзянам немагчыма будзе без біяметрычнага пашпарта выехаць з Беларусі. Хоць іншыя дзяржавы і настойліва раяць прыняць нам стандарты біяметрычнага пашпарта, але яны ж і дапамагаюць укараняць гэтыя тэхналогіі ў нашай краіне, каб беларусы аднойчы не апынуліся ў ізаляцыі ад астатняга свету.

Міністэрства ўнутраных справаў Беларусі ў пачатку 2005 года выступіла з ініцыятывай заняцца падрыхтоўкай да ўвядзення біяметрычных дакументаў. Адказам на гэтую ініцыятыву стаў праект прадстаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Міжнароднай арганізацыі па міграцыі (МАМ) сумесна з Прадстаўніцтвам Еўрапейскай Камісіі (ЕК) пад назвай «Павышэнне патэнцыялу Рэспублікі Беларусь у галіне кіравання міграцыйнымі працэсамі» — скарочана «МІГРАБЕЛ».

Праект быў накіраваны на вывучэнне магчымасці ўвядзення ў Беларусі электронных пашпартоў з біяметрычнымі дадзенымі ўладальніка. На рэалізацыю гэтага праекта 700 тысяч еўра было выдаткавана Еўрапейскай Камісіяй, 50 тысяч еўра — АБСЕ і 25 тысяч еўра — уласна МАМ. Праект быў рэалізаваны разам з МУС Беларусі з 2007 па 2009 год.

### Якім будзе новы беларускі біяметрычны пашпарт

Электронны чып, які змяшчае біяметрычныя дадзеныя ўладальніка, будзе знаходзіцца ў вокладцы пашпарта. «На чыпе, убудаваным у вокладку пашпарта, будзе захавана лічбавая фатаграфія чалавека, — тлумачыць Анатоль Ланін, намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь. — Можна таксама перанесці на чып адбіткі пальцаў рукі, інфармацыю аб росце, вазе і групе крыві ўладальніка. У розных краінах Еўропы да гэтых параметраў ідэнтыфікацыі ёсць свае патрабаванні. У нас жа, акрамя фатаграфіі, будуць дадаткова яшчэ і адбіткі пальцаў».

Здымаць «пальчыкі» ў грамадзян будуць спецыяльнымі сканерамі, якія ўжо знаходзяцца ў распараджэнні МУС. У ліпені 2009 года ў рамках гэтага праекта для Міністэрства ўнутраных справаў было закуплена неабходнае абсталяванне на суму больш за 200 тысяч долараў. Спецыялістаў, якія будуць у Беларусі займацца практычнымі пытаннямі, рыхтавалі ў рамках праекта Еўрапейскай Камісіі «Павышэнне патэнцыялу Беларусі ў галіне кіравання міграцыйнымі працэсамі». Беларускія спецыялісты ездзілі ў Германію, Францыю, Вялікабрытанію, Аўстрыю і Швейцарыю, дзе змаглі дасканала даведацца ўсё пра выраб біяметрычных пашпартоў, чыпаў і абсталявання для счытвання дадзеных.

### Усё гатова?

У Беларусі ёсць усё неабходнае, каб у самым хуткім часе ўвесці біяметрыю ў дакументах. Прыборы, якія счытваюць інфармацыю з чыпаў, Беларусь вырабляе самастойна, і гэтыя прыборы ўжо прымяняюцца ў рабоце. Тыя, хто перасякаў мяжу Беларусі, напэўна, заўважылі, як на мытным кантролі памежнік прыкладае пашпарт да партатыўнага камп'ютара — менавіта так счытваецца інфармацыя з чыпаў.

Але гатоўнасць у гэтым пытанні яшчэ не поўная: трэба стварыць цэнтр па вытворчасці чыпаў і распрацаваць сістэму запісу дадзеных. Варта таксама прыдумаць, як збіраць інфармацыю аб вялізнай колькасці людзей і пераносіць яе на чыпы. Для гэтага, кажа Анатоль Ланін, патрэбныя дзве ўмовы: указ прэзідэнта Беларусі і грошы. І тады праз два гады ўсё будзе працаваць як трэба.

**Віталь Ругайн**

НАША СТРАВА

### Грушы падсушаныя ў цукры

Сапяжанкі або цукроўкі абабраць. Абрэзаныя грушы кідаць у халодную ваду, каб не пачарнелі, пакуль не будуць ачышчаныя ўсе. Пасля ўсе грушы выняць з халоднай вады, заліць кіпенем і варыць да мяккасці (каб можна было праткнуць саломінкай). Зрабіць густы сіроп з вады, у якой варыліся грушы, і цукру. Засмажыць у ім грушы і пакінуць у сіропе на 24 гадзіны. Пасля гэтага выкласці грушы на бляхі або фаянсавыя блюды і падсушыць у цёплай печы.

### Артышокі

15 артышокаў, 1 лыжка цёртых сухароў, 1 лыжка масла, булён.

Пачысціць артышокі. Ваду пасаліць і пасаладзіць, давесці да кіпення. У кіпень пакласці артышокі і адварыць. Калі артышокі будуць гатовыя (праз 30—40 хвілін), выкласці іх на блюда і заліць сухарным соусам або маслам з падрумяненымі ўім сухарамі.

Для разнастайнасці артышокі можна падаваць фаршыраваныя зрабнёнымі курынымі або індычнымі грудкамі, або ракамі. У гэтым выпадку з артышокаў перад адварваннем вымаюць сярэдзіну.

З кнігі: Вінцэнта Завадская, «Кухарка літоўская»

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

**ВІКТАР ЛУНІН**

ВЕТЛІВАЯ СЛАНІХА

Выйшла сланіха з кустоў на дарожку
Ды наступіла мурашцы на ножку.
І ветліва вельмі мурашцы сказала:
— Я не супраць, каб і ты на маю
наступала!

**Пераклад: kazki.by**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАННІ

**Віншуем Андрэя Катлярчука** з нараджэннем дачкі. Хай расце здаровенькая і разумненькая! Сябры.

СПАЧУВАННІ

**Сяргею Панамарову** ў сувязі са смерцю мамы. Трымайцеся. Сябры і паплечнікі

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e—mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

КОНКУРС

### Цішоткі вольных беларусаў

Што мы ведаем пра свабоду, якой яе ўяўляем і хочам бачыць у Беларусі? Прапануем творча адказаць на гэтае пытанне ў выглядзе ДЫЗАЙНЕРСКАГА ПРЫНТА. Прапаноўвайце свае варыянты «Цішоткі вольнага беларуса».

Да 29 лістапада на паштовую скрыню tishotka@tut.by прымаюцца распрацаваныя Вамі варыянты малюнкаў (прынтоў), якія ў далейшым магчыма знойдуць увасабленне на цішотках беларусаў.

Пераможцы конкурсу «Цішоткі вольных беларусаў» атрымаюць грашовыя ўзнагароджанні за першае, другое і трэцяе месца ў памеры 400, 300 і 200 тыс. бел. рублёў адпаведна.

Падрабязнасці на сайце кампаніі: tishotka.blog.tut.by



«Вузкі іх круг...» Камуністы адзначылі 7 лістапада ўскладаннем кветак да помніка Леніну.





**Тыдзень моды Беларусі адкрыў фэст «Лён-2009». Свае льняныя калекцыі паказалі два дзясяткі мадэльераў і прадпрыемстваў, у тым ліку «Світанак», «Купалінка», «Аршанскі льнокамбінат», гомельскі «Камінтэрн». ...А вы будзеце такое насіць?**

**Калекцыя «Нягледзячы ні на што» Наталлі Гайдаржы.**







**Брытанскі баксёр Дэвід Хей, нягледзячы на розніцу ў вазе ў 44 кг, пабіў вялікага і страшнага расійца Мікалая Валуева і забраў тытул чэмпіёна свету па версіі СБА.**







**Турцыя, Стамбул. Дэзінфекцыя школьнага класа ў сувязі са свіным грыпам.**

## АНЕКДОТЫ

Ва Украіне лютуе свіны грып... Следам у Беларусі мае пачацца бульбяны грып, а ў Расіі — гарэлачны.

* * *

Ніколі не расказвайце новай сяброўцы пра тыя пакасці, якія вам рабілі папярэднія. Не варта падкідаць ёй ідэі.

* * *

— У мяне знаёмы трусоў трымае.

— А навошта ён іх трымае?

— Бо, калі іх не трымаць, яны плодзяцца!

* * *

Добра зараз у транспарце. Чхнуў — адразу вольнае месца!

* * *

Закон рэкламы:

— Няважна, што гэта, але калі яно гудзе, міргае і патрабуе не менш за шэсць батарэек, большасць мужчынаў захочуць гэта набыць.

* * *

Універсальная рэклама:

— З тае пары, як я пачала карыстацца зубной пастай XXX, я забылася, што такое карыес.

Аднавіць памяць мне ўдалося з дапамогай лекавага прэпарата YYY.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**С.Нарошы Лідскага павета.** Хіба нідзе няма такой выгоды, як цяпер у нашым сяле і суседніх Пакрове і Астрыне. Тры канцылярыі злажылі па сто рублёў і за гэтыя грошы завялі ў сябе тэлефоны, так што хоць за вёрст сто можна гутарыць, як у адной хаце. Выгода вялікая, а і смеху, і весялосці хватае. Не шкодзіла б, каб усюды пазаводзілі гэткія тэлефоны, тады менш было б язды, хады.

**«НН». №45. 1909**

**Помнік на Кальварыі**

На Кальварыі адкрылі помнік дзецям, што загінулі ў траўні на Нямізе — тут іх пахавана шасцёра — камень з шыльдаю і крыжом Еўфрасінні. Улады не далі адкрыць помнік на Дзяды, баяліся дэманстрацыі. Рабіў яго скульптар Міхал Інькоў, чыя дачка тады на той свет пайшла.

**«НН». №31. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6220. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 10.11.2009.
Замова № 6190.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614